ГАЛЕРЭЯ ЧАЛАВЕЧАЙ ДУМКІ

Г.Ф.В. ГЕГЕЛЬ

# ВУЧЭННЕ аб ПАНЯЦЦІ і ФІЛАСОФСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ



Галерэя чалавечай думкі

*Георг Ф. В. Гегель*

# ВУЧЭННЕ АБ ПАНЯЦЦІ
## І ФІЛАСОФСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

Georg Fr. Wilhelm Hegel

# Begriffslehre

## und philosophische Enzyklopädie

Berlin
Duncker und Humblot
1840

Геарг Ф. В. Гегель

# Вучэнне аб паняцці
## і філасофская энцыклапедыя

Пераклад з нямецкай
Лявона Баршчэўскага

Мінск
Выдавец Зміцер Колас
2023

УДК 1(091)“652”
ББК 87.3(0)
Г27

Серыя заснаваная ў 2001 годзе

Пераклад выкананы паводле выдання:
Georg Friedrich Wilhelm Hegel’s Werke. Vollständige Ausgabe. Bd. 18.
Berlin: Duncker und Humblot, 1840. S. 123–205.

*На вокладцы выкарыстаная гравюра Андрэя Фядорчанкі «Філосафы» (май, 2005).*

**Гегель,** Г. Ф. В.
Г27 Вучэнне аб паняцці і філасофская энцыклапедыя / Георг Фрыдрых Вільгельм Гегель ; пер. з нямецкай Л. Баршчэўскага. — Мінск : Выдавец Зміцер Колас, 2023. — 108 с. — (Галерэя чалавечай думкі)
ISBN 978-985-23-0212-8.

Георг Вільгельм Фрыдрых Гегель (1770–1831) – выбітны мысляр, прадстаўнік гямецкай класічнай філасофіі, стваральнік сістэматычнай тэорыі дыялектыкі на падставе аб'ектыўнага ідэалізму. Праца, змешчаная ў гэтым выданні, уяўляе сабою частку лекцыйнага курса, які філасаф чытаў з 1808 па 1816 г. у гімназіі «Эгідыен» у Нюрнбергу.

Адрасуецца шырокай чытацкай аўдыторыі.

**УДК 17.034**
**ББК 87.7(0)**

**ISBN 978-985-23-0212-8**

© Баршчэўскі Л. П., пераклад на беларускую мову, 2023
© Афармленне. Выдавец Зміцер Колас, 2023

# ПЕРШЫ АДДЗЕЛ
# ВУЧЭННЕ АБ ПАНЯЦЦІ

## [Уводзіны]

§ 1

Аб'ектыўная логіка — гэта навука пра паняцце як такое, пра катэгорыі. У той самы час, суб'ектыўная ж логіка, пра якую тут ідзе гаворка, гэта навука аб паняцці як паняцці датычным чагосьці. Яна падзяляецца на тры часткі:

1) вучэнне аб паняцці;

2) вучэнне пра рэалізацыю паняцця;

3) вучэнне пра ідэі.

### Першы раздзел
### Вучэнне аб паняцці

*I. Паняцце*

§ 2

Паняцце — гэта тое ўсеагульнае, якое разам з тым вызначана і застаецца ў сваім вызначэнні тым жа самым цэлым і тым жа самым усеагульным, г. зн. такая пэўнасць, у якой розныя вызначэнні рэчы змяшчаюцца як адзінае.

§ 3

Моманты паняцця — гэта ўсеагульнасць, асаблівасць і адзінкавасць. Яно ёсць іх адзінствам.

§ 4

Усеагульным гэтае адзінства ёсць як пазітыўнае, самому сабе роўнае нявызначанае адзінства; асаблівасць ёсць вызначэннем усеагульнага, але такім, якое знятае ўва ўсеагульным; інакш кажучы, гэта такое вызначэнне, у якім усеагульнае застаецца тым самым, чым яно і было; адзінкавасць ёсць адмоўным адзінствам або вызначэннем, якое абагульняецца ў самавызначэнні.

§ 5

Усеагульнае ахоплівае асаблівае і адзінкавае, гэтаксама як і асаблівае ахоплівае адзінкавае; наадварот, адзінкавае ўтрымлівае асаблівасць і ўсеагульнасць, гэтаксама як і асаблівае ўтрымлівае ўсеагульнасць *у самім сабе*. Усеагульнае *шырэйшае* за асаблівасць і адзінкавасць, затое асаблівасць і адзінкавасць утрымліваюць у сабе *больш* за ўсеагульнае, якое дзякуючы таму, што яно ўтрымліваецца ў адзінкавасці, зноў становіцца пэўнай вызначанасцю. Усеагульнае ўласціва асабліваму і адзінкаваму, у той час як асаблівае і адзінкавае падпарадкаваныя яму.

§ 6

У якой меры паняцце ўтрымлівае ў сабе моманты адзінкавасці, асаблівасці і ўсеагульнасці, у такой самай меры і само яно. адпаведна гэтаму, па-рознаму вызначана сваім зместам і бывае паняццем пра штосьці адзінкавае, асаблівае або ўсеагульнае.

§ 7

Усе адасабленні ўсеагульнага, г. зн. вызначэнні, якія маюць адну і тую ж усеагульную сферу, гэтаксама як і адзінкавыя [азначэнні], падпарадкаваныя адной і той жа асаблівасці

або ўсеагульнасці, *каардынуюцца* адно з адным; гэтак жа сама і падпарадкаванае *субардынуецца* да таго, чаму яно падпарадкавана.

§ 8

Каардынаваныя асаблівыя вызначэнні ўсеагульнага процілеглыя адно аднаму. У тым выпадку, калі адно з іх бярэцца толькі як негатыўнае вызначэнне іншага, яны *кантрадыктарныя*; калі ж другое вызначэнне таксама валодае пазітыўнасцю, з прычыны чаго яны абодва падпадаюць пад адну і тую ж усеагульную сферу, яны процілеглыя толькі кантрарна. Такія каардынаваныя ўнутры ўсеагульнага вызначэнні не могуць разам знаходзіцца ў адзінкавым. У той жа час, вызначэнні, каардынаваныя ўнутры адзінкавага, розныя, г. зн. у сваім адрозненні яны не маюць адной і той жа ўсеагульнай сферы і ў дачыненні да адзінкавага *аднадушныя*.

§ 9

Калі разгледзець каардынаваныя вызначэнні ўсеагульнага падрабязней, то яны бываюць: 1) адно негатыўным вызначэннем іншага наогул, незалежна ад таго, маюць яны адну і тую ж усеагульную сферу або не; 2) калі яны маюць адну і тую ж агульную сферу і адно вызначэнне пазітыўнае, а другое негатыўнае, прычым гэтая негатыўнасць у параўнанні з першым вызначэннем утварае прыроду другога вызначэння, то яны, уласна кажучы, процілеглыя кантрадыктарна; 3) калі яны процілеглыя ў адной і той жа ўсеагульнай сферы, г. зн. адно вызначэнне сапраўды гэткае самае пазітыўнае, як і другое, і, такім чынам, кожнае ў дачыненні да іншага ў аднолькавай ступені можа быць выказана і пазітыўна, і негатыўна, то яны кантрарныя.

§ 10

Разам з кантрарным вызначэннем, для якога абыякавая процілегласць пазітыўнага і негатыўнага, здзяйсняецца пераход да таго, каб *не быць вызначаным дзякуючы чамусьці іншаму*, да таго, *каб быць вызначаным у сабе і для сябе*, у выніку чаго агульнасць сферы знікла і мы маем адзінкавасць, вызначэнні якой розныя, не маюць усеагульнай сферы і існуюць усярэдзіне адзінак як вызначаныя ў сабе і для сябе.

## *II. Суджэнне*

§ 11

Суджэнне — гэта выяўленне пэўнага прадмета ў розных момантах паняцця. Суджэнне змяшчае: a) прадмет у вызначэнні адзінкавасці як суб'ект; b) яго вызначэнне ўсеагульнасці, або яго прэдыкат, прычым, аднак жа, суб'ект можа суадносіцца з прэдыкатам і як адзінкавасць з асаблівасцю, і як асаблівасць з усеагульнасцю; c) простае беззмястоўнае суаднясенне прэдыката з суб'ектам: «ёсць», інакш кажучы, *звязкай* (*Copula*).

§ 12

Ад суджэння трэба адрозніваць такое *выказванне*, у якім адносна суб'екта выказваецца або нешта суцэльна адзінкавае, нешта, што *здарылася*, або ж, як гэта бывае ў агульных выказваннях, штосьці такое, з чым ён звязаны неабходным чынам, чым ён становіцца і да чаго ў сваёй сутнасці адносіцца як процілеглае. Паколькі ў паняцці моманты ўтрымліваюцца як у пэўным адзінстве, то і ў суджэнні, як выяўленні паняцця, вызначэнне хоць і прысутнічае, але не як станаўленне або праціпастаўленне. Ніжэйшае вызначэнне, суб'ект, узвышае сябе да адрознай ад яго ўсеагульнасці, да прэдыката або, лепш сказаць, і ёсць ужо непасрэдна гэтым прэдыкатам.

§ 13

У логіцы суджэнне разглядаецца толькі з боку яго чыстай формы, незалежна ад якога-небудзь вызначанага эмпірычнага зместу. Суджэнні адрозніваюцца адно ад аднаго паводзінамі суб'екта і прэдыката, тым, якія іх дачыненні дзякуючы паняццю і ў паняцці — інакш кажучы, тым, наколькі іх дачыненні ёсць дачыненнямі прадметнасці з паняццем. Ад характару гэтых дачыненняў залежыць вышэйшая ці, лепш сказаць, абсалютная праўда (ісціна) суджэння. Ісціна — гэта адпаведнасць паняцця свайму прадмету. Гэтае выяўленне паняцця і яго прадметнасці, а значыць і абсяг ісціны, пачынаецца ў суджэнні.

§ 14

Паколькі суджэнне ёсць выяўленнем пэўнага прадмета ў розных момантах паняцця, то са свайго зваротнага боку любое суджэнне — гэта выяўленне паняцця ў яго тут-быцці, пры гэтым не столькі дзякуючы вызначанаму зместу, колькі дзякуючы таму, што ў суджэнні моманты паняцця выходзяць са свайго адзінства. Наколькі цэлае суджэнне ўяўляе сабой паняцце ў яго тут-быцці, настолькі ж і гэтае адрозненне ў сваю чаргу становіцца формай самога суджэння. Суб'ект — гэта прадмет, а прэдыкат — яго ўсеагульнасць, менавіта прэдыкат і павінен даць яму выраз як паняццю. Праходзячы праз свае разнавіднасці, суджэнне ўздымае гэтую ўсеагульнасць на больш высокую прыступку, на якой яна становіцца настолькі адпаведнай паняццю, наколькі яна наогул можа адпавядаць яму, застаючыся прэдыкатам.

*А. Якасць суджэнняў ці суджэнні ўласцівасці*

§ 15

Непасрэдна прэдыкат такога суджэння ёсць пэўнай уласцівасцю, якая належыць суб'екту так, што хоць у прынцыпе

яно і ставіцца да яго як нешта ўсеагульнае, але ў той жа час уяўляе сабой толькі нейкае пэўнае тут-быццё суб'екта, толькі адну пэўную колькасць яго вызначанасцяў. Усеагульнасць, прэдыкат, мае ў такім суджэнні значэнне толькі нейкай непасрэднай (або пачуццёвай) усеагульнасці, простай агульнасці з іншымі.

§ 16

У якасным суджэнні прэдыкат выступае і як нешта ўсеагульнае, прычым менавіта гэты бок якраз складае форму суджэння, і як нейкая пэўная якасць суб'екта, прычым менавіта яна і ўяўляе сабой змест. Узятае з першага боку, такое суджэнне ў сваёй чыстай *форме* абвяшчае: *адзінкавае — гэта пэўнае ўсеагульнае*; узятае з другога боку, з боку зместу, яно абвяшчае: *адзінкавае вызначана гэтак і гэтак.* [Гэта] *пазітыўнае суджэнне* наогул.

(Гэта добра; гэта дрэнна; гэтая ружа чырвоная; гэтая ружа белая і г. д.)

§ 17

Паколькі: 1) адзінкавае настолькі ж і не ёсць усеагульнае, а: 2) суб'ект валодае не толькі *гэтай* пэўнасцю, то якаснае суджэнне і ў тым, і ў другім дачыненні, несумненна, можа быць выяўлена таксама і негатыўным чынам, у выглядзе *негатыўнага суджэння.*

(Гэта не дрэнна; гэта не добра; гэтая ружа не чырвоная, а белая, жоўтая і г. д.; гэтая ружа не белая, а чырвоная і г. д.)

§ 18

Паводле сваёй формы гэтае суджэнне, такім чынам, абвяшчае: *адзінкавае не ёсць усеагульным, а ёсць пэўным асаблівым*; а паводле зместу: *адзінкавае вызначана не так,*

*а перш за ўсё іначай.* І ў тым, і ў другім дачыненні гэтае негатыўнае суджэнне ёсць адначасова і пазітыўным. У першым выпадку адмаўленне ўяўляе сабой толькі абмежаванне ўсеагульнасці да асаблівасці, у той час як у другім выпадку адмаўляецца толькі нейкая адна вызначанасць і праз гэтае адмаўленне праступае ўсеагульнасць, г. зн. больш высокая сфера гэтай вызначанасці.

§ 19

І нарэшце: 1) паводле формы адзінкавае не ёсць і пэўным асаблівым, бо асаблівасць шырэйшая за адзінкавасць, а адзінкавае ёсць толькі адзінкавым — *тоесным суджэннем.*

З другога боку, 2) паводле зместу суб'ект не толькі не ёсць вось гэтай пэўнасцю, але не ёсць таксама і толькі нейкай іншай пэўнасцю. Такі змест занадта абмежаваны для суб'екта. Гэтым апошнім адмаўленнем пэўнасці здымаецца ўся сфера прэдыката, а разам з гэтым здымаюцца і пазітыўныя дачыненні, якія яшчэ меліся ў папярэднім адмоўным суджэнні: *бясконцае суджэнне.*

§ 20

Згаданае раней тоеснае суджэнне, як і бясконцае суджэнне, уласна кажучы, ужо не ёсць суджэннямі. Інакш кажучы, стасунак, які меў месца паміж суб'ектам і прэдыкатам у якасным суджэнні, зняты, і менавіта тады, калі датычна суб'екта выказваецца толькі якая-небудзь непасрэдная пэўнасць яго тут-быцця, што валодае толькі павярхоўнай усеагульнасцю. У бясконцым суджэнні запатрабавана такая ўсеагульнасць, якая ўжо не ёсць толькі нейкай асобнай вызначанасцю. Згаданае тоеснае суджэнне азначае, што суб'ект вызначаны ў сабе і для сябе і ў сваім вызначэнні вярнуўся ў сябе.

§ 21

У тоесным суджэнні і ў бясконцым суджэнні стасункі суб'екта і прэдыката знятыя. Гэта трэба разумець перш за ўсё як той бок суджэння, з якім суб'ект і прэдыкат, абстрагуючыся ад іх адрознення, можна дзякуючы звязцы (Copula) разглядаць як тыя, што знаходзяцца ў дачыненнях роўнасці. Узятае з гэтага боку, пазітыўнае суджэнне можа стаць адваротным толькі ў тым выпадку, калі прэдыкат бярэцца ў значэнні, якое паводле свайго аб'ёму тоеснае з суб'ектам.

§ 22

У негатыўным суджэнні раз'яднанне пэўнай вызначанасці і суб'екта такое, што суб'ект, у кожным выпадку, пазітыўна дачыняецца з нявыяўленай усеагульнай сферай гэтай вызначанасці. Калі прэдыкат, які адмаўляецца, мы зробім суб'ектам, то згаданая ўсеагульная сфера адпадае сама сабой і застаецца адно толькі няроўнасць двух вызначэнняў, і, у сувязі з гэтым, няважна, якое з іх зрабіць суб'ектам, а якое прэдыкатам. Таму адмоўнае суджэнне, як, зрэшты, і тоеснае суджэнне, можа *стаць адваротным*.

*B. Колькасць суджэння або суджэнні рэфлексіі*

§ 23

Робячы суджэнні адваротнымі, мы абстрагуемся ад адрознення паміж суб'ектам і прэдыкатам. Але цяпер, калі гэтае адрозненне як якаснае адрозненне ўжо знятае, нам варта зірнуць на яго з колькаснага боку.

§ 24

Калі адзінкавыя вызначанасці, якія змяшчалі свой прэдыкат, здымаюцца, прэдыкат павінен змяшчаць разнастайныя

вызначэнні суб'екта, абагульняючы іх. Дзякуючы гэтаму *ўсеагульнасць* перастае быць толькі *агульнасцю* з іншымі. Яна цяпер — *уласная* ўсеагульнасць суб'екта, якая, разам з тым, змяшчае ў сабе і тое, што суб'ект у сваім прэдыкаце вярнуўся ў самога сябе.

§ 25

Такое суджэнне ёсць суджэннем рэфлексіі, бо *рэфлексаванне* наогул ёсць узыходжаннем да шматлікіх вызначэнняў прадмета і падсумоўваннем іх у пэўным адзінстве, што мае месца дзякуючы гэтаму.

§ 26

Паколькі ў суб'екце выяўляецца яго роўнасць з прэдыкатам, суб'ект ёсць чымсьці ўсеагульным, якое дзякуючы абмежаванню перш за ўсё адзінкавасцю і ўяўляе сабой суб'ект. Такім чынам, якаснае суджэнне ёсць 1) *сінгулярным* суджэннем, якое мае вызначэннем суб'екта *найпаўнейшую* адзінкавасць і якое абвяшчае: вось гэтае ёсць усеагульным.

§ 27

Але кожнае *гэтае* вызначана да бясконцасці шматстайна, г. зн. яно вызначальнае ў нявызначанасці. Прэдыкат рэфлексіі ў выніку таго, што ён ёсць пэўным падсумоўваннем, выяўляе ўсеагульнае вызначэнне не толькі *аднаго* вось гэтага, але і *другога* вось гэтага; інакш кажучы, сінгулярнае суджэнне пераходзіць у: 2) *партыкулярнае*.

§ 28

Партыкулярнае суджэнне, у якім суб'ект вызначаны як «*сёе-тое*», уяўляе сабой толькі пэўнае суджэнне, якое непасрэдна можна выказаць як пазітыўна, так і негатыўна.

§ 29

Паводле аб’ёму сваёй формы суб’ект атрымлівае сваё поўнае вызначэнне праз вызначэнне цэласнасці ўва *ўніверсальным* суджэнні. Паколькі цэласнасць займае тут месца партыкулярнасці і, у той жа час, мае аб’ём апошняй, то і аб’ём зместу суб’екта трэба абмежаваць у адпаведнасці з гэтым.

§ 30

Тым самым, з аднаго боку, суб’ект становіцца датычна свайго прэдыката пэўным асаблівым суб’ектам, а з другога боку, паміж суб’ектам і прэдыкатам узнікае дачыненне неабходнасці.

*C. Суадносіны суджэнняў, або суджэнні неабходнасці*

§ 31

Праз зняцце якаснага і колькаснага вызначэнняў усталёўваецца адзінства зместу суб’екта і прэдыката, якія *адрозніваюцца* цяпер *толькі сваёй формай*, так што адзін і той жа аб’ект у адным выпадку ўключаецца ў вызначэнне суб’екта, у іншым выпадку — у вызначэнне прэдыката.

§ 32

Паколькі ў дачыненні да свайго прэдыката суб’ект ёсць асаблівым, то цяпер ужо адваротна таму, што мы бачылі ў якасным суджэнні, *суб’ект* ёсць *вызначанасцю* прэдыката і непасрэдна падведзены пад яго. Усеагульнасць прэдыката выяўляе, такім чынам, не толькі падсумаванне вызначанасцяў суб’екта ў якасці прэдыката рэфлексіі, але і *ўсеагульную ўнутраную прыроду* суб’екта: [гэта] *катэгарычнае* суджэнне.

(Цела мае цяжар. Золата — гэта метал. Дух разумны.)

§ 33

Аднак з прычыны таго, што суб'ект і прэдыкат не толькі тоесныя, але і розныя, іх адзінства павінна быць выяўлена як *адзінства процілегласцяў*, г. зн. як неабходнае дачыненне: [гэта] *гіпатэтычнае* суджэнне.

§ 34

Тоеснасць зместу, якая ёсць у катэгарычным суджэнні, і дачыненне процілегласцяў або адрозненняў у гіпатэтычным суджэнні, аб'яднаныя ў *дыз'юнктыўным* суджэнні, у якім суб'ект ёсць усеагульнай сферай або разглядаецца ў якасці апошняй, што таксама ўтварае прэдыкат, які выяўляе адасабленне або розныя вызначэнні суб'екта. Як першыя, гэтак і апошнія *ў сваёй сукупнасці* належаць усеагульнаму. Паводле свайго адасаблення і ў дачыненні да суб'екта яны ўзаемна выключаюць адно аднаго.

*D. Мадальнасць суджэнняў, або суджэнні, якія суадносяць паняцце з тут-быццём*

§ 35

У дыз'юнктыўным суджэнні тут-быццё ўключаецца ўва ўсе моманты паняцця. Мадальнасць суджэння палягае толькі ў тым, што нешта тут-бытнае дачыняецца са сваім паняццем як такім, і прэдыкат выяўляе толькі *адпаведнасць* або *неадпаведнасць* абодвух.

§ 36

Першае суджэнне мадальнасці ёсць суджэннем *асертарычным*. Яно ёсць толькі *запэўненнем* у той меры, у якой у ім яшчэ не выяўлена ані *ўласцівасць суб'екта*, якая *павінна параўноўвацца з паняццем*, ані само паняцце, таму такое суджэнне спачатку можа быць даведзена толькі суб'ектыўна.

(Гэты ўчынак дрэнны; гэтыя словы праўдзівыя.)

§ 37

Насуперак запэўненню асертарычнага суджэння такім чынам сапраўды магчымае гэтак сама і сцверджанне *процілеглага*, а прэдыкат выказвае толькі адну з гэтых процілеглых вызначанасцяў, у той час як суб'ект, трактаваны як усеагульная сфера, можа ўтрымліваць іх *абедзве*. Дзякуючы гэтаму асертарычнае суджэнне пераходзіць у *праблематычнае*, якое сцвярджае толькі *магчымасць* адпаведнасці або неадпаведнасці пэўнага тут-быцця паняццю.

§ 38

У сувязі з гэтым усеагульнасць суб'екта вызначаецца з пэўным абмежаваннем, што выяўляе ўласцівасць, у якім палягае адпаведнасць або неадпаведнасць тут-быцця і паняцця. Прэдыкат не выяўляе нічога, акрамя гэтай роўнасці ці няроўнасці ўласцівасці і паняцця рэчы. Такое суджэнне ёсць *ападыктычным*.

*III. Лагічны вывад*

§ 39

Лагічны вывад — гэта поўнае выяўленне паняцця. Наогул ён ўтрымлівае *суджэнне з падставай апошняга*. Тут два вызначэнні злучаныя праз трэцяе, што ўяўляе сабой іх адзінства. У наяўнасці паняцце ў яго адзінстве — сярэднім тэрміне лагічнага вываду і ў яго раздвойванні — экстрэмумах лагічнага вываду.

§ 40

Суаднясенне абодвух экстрэмумаў лагічнага вываду з сярэднім тэрмінам непасрэднае; аднак суаднясенне іх аднаго з адным апасродкавана сярэднім тэрмінам. Абодва першыя непасрэдныя суаднясенні ўяўляюць сабой суджэнні, якія

называюцца *першапастулатамі*; а тое суаднясенне, якое апасродкавана, называецца *заключэннем*.

§ 41

Спачатку лагічны вывад выяўляе свае моманты толькі чыстай формай, так што сярэдні тэрмін у дачыненні да экстрэмумаў выступае як самастойная вызначанасць, а падстава, або адзінства момантаў — яшчэ толькі суб'ектыўна. Тое, што само ў сабе першапачатковае, тут выступае як нешта выснаванае і мае значэнне наступства.

*А. Лагічныя вывады якасці або ўласцівасці*

§ 42

Форма гэтага лагічнага вываду, Адз. — Ас. — Ус., якая азначае, што нешта *адзінкавае* злучана з *усеагульным* праз *асаблівае*, ёсць агульным правілам лагічнага вываду наогул. У гэтым першым непасрэдным лагічным вывадзе асаблівае, або сярэдні тэрмін, уяўляе сабой пэўную *якасць*, ці то вызначанасць адзінкавага, гэтак жа сама як і ўсеагульнае выяўляе пэўную вызначанасць асаблівага. Менавіта таму і можна ад *адзінкавага* праз якую-небудзь *іншую* з яго вызначанасцяў, якіх у яго шмат, а гэтаксама і ад яе перайсці да нейкай *іншай усеагульнасці*; дакладна гэтак жа да іншай усеагульнасці можна перайсці і ад *асаблівага*, бо асаблівае таксама змяшчае ў сабе розныя вызначэнні. Гэты першы лагічны вывад, такім чынам, хоць і слушны паводле сваёй формы, паводле свайго зместу, аднак, *адвольны* і *выпадковы*.

(Зялёны колер прыемны; гэты ліст зялёны; такім чынам, ён прыемны. — Пачуццёвае ні кепскае, ні добрае. А чалавек жа пачуццёвы. Такім чынам, ён ні кепскі, ні добры. — Адвага ёсць дабрадзейнасцю. Аляксандр меў адвагу. Такім чынам,

ён быў дабрадзейны. — П’янства ёсць заганай. Аляксандр заграз у п’янстве. Такім чынам, ён заганны, і г. д.).

§ 43

Паводле сваёй формы абодва першапастулаты ёсць тут непасрэднымі дачыненнямі. Форма лагічнага вываду змяшчае, аднак, патрабаванне, каб і яны былі апасродкаваныя або, як гэта звычайна выяўляецца, каб першапастулаты мусілі быць даказаныя. Але доказ з дапамогай гэтай формы лагічнага вываду быў бы толькі паўторам адпаведнай формы, прычым да бясконцасці паўтаралася б і тое самае патрабаванне.

§ 44

Апасродкаванне, а менавіта апасродкаванне асаблівасці і ўсеагульнасці, трэба, такім чынам, зрабіць з дапамогай моманту адзінкавасці. Гэта дае другую форму лагічнага вываду: Ус. — Адз. — Ас. Першым чынам гэты лагічны вывад слушны толькі ў тым выпадку, калі Ус. — Адз. уяўляе сабой дзейнае суджэнне. А каб гэта было так, Ус. павінна быць партыкулярным. Такім чынам, адзінкавае, уласна кажучы, не ёсць сярэднім тэрмінам. Лагічны вывад зведзены да формы першага лагічнага вываду, але заключэнне тут партыкулярнае. (Шмат якія логікі лічаць, што няма неабходнасці зводзіць другую фігуру да першай, паколькі высноўваць у ёй можна; аднак напраўду высноўваць у ёй можна дзякуючы менавіта гэтай форме). Па-другое, аднак жа, гэты лагічны вывад, наогул, азначае, што непасрэдныя вызначэнні, або, дакладней, непасрэдныя якасці, злучаныя праз адзінкавасць і ў гэтым сэнсе злучаныя выпадкова.

§ 45

Адзінкавае, злучанае з асаблівым праз усеагульнае, дае трэцюю форму лагічнага вываду: Ас. — Ус. — Адз. Усе-

агульнае выступае тут як апасродкаванае вызначэнне і ў абодвух першапастулатах ёсць прэдыкатам. Але гэтаксама, як з таго, што два вызначэнні ўласцівыя аднаму і таму ж адзінкаваму, не вынікае, што гэтыя вызначэнні — адно і тое самае, то і з таго, што два вызначэнні падведзены пад адно і тое самае ўсеагульнае, не вынікае, што іх можна злучыць як суб'ект і прэдыкат. Толькі ў тым выпадку, калі галоўнае выказванне негатыўнае і, такім чынам, можа быць павернутае ў адваротны бок, гэты лагічны вывад можа быць зведзены да першага і, адпаведна, мае слушную форму.

(Ніводная смяротная істота не святая. Бог не ёсць смяротнай істотай. Такім чынам, Бог святы.)

§ 46

Аб'ектыўны сэнс такога лагічнага вываду палягае ў тым, што адзінай падставай злучэння асаблівасці з адзінкавасцю ёсць іх тоесная прырода.

§ 47

У шэрагу гэтых лагічных высноў, па-першае, кожнае з трох вызначэнняў пабывала ўжо сярэднім тэрмінам. Звядзенне другой і трэцяй формы лагічнага вываду да першай азначае *зняццё якаснасці*. Па-другое, хоць кожныя непасрэдныя суадносіны першага лагічнага вываду і былі апасродкаваныя наступнымі лагічнымі вывадамі, тым не менш кожны з гэтых наступных лагічных вывадаў бярэ пад увагу папярэднія лагічныя вывады, або, інакш кажучы, кожнае апасродкаванае адзінства бярэ пад увагу непасрэдную роўнасць.

*В. Лагічныя вывады колькасці, або рэфлексіі*

§ 48

Любы непасрэдна бяз'якасны лагічны вывад — *матэматычны*. Сярэднім тэрмінам у ім бывае толькі нешта такое,

што роўна дзвюм іншым рэчам. Выяўлены як тэза, гэты лагічны вывад абвяшчае: калі дзве велічыні роўныя трэцяй, то яны роўныя паміж сабой.

§ 49

Па-другое, у колькасным лагічным вывадзе адзінкавасць, утвараючы сярэдні тэрмін, уяўляе сабой не адзін адзінкавы прадмет, а *ўсе адзінкавыя* прадметы. Калі нейкая якасць прыналежная адначасова ўсім, яе выказваюць як якасць той усеагульнай сферы або, дакладней, таго гатунку, да якога належаць адзінкавыя прадметы; гэта *лагічны вывад індукцыі*.

§ 50

Лагічны вывад, у якім сярэдні тэрмін ёсць чымсьці *ўсеагульным*, выводзіць паводле аналогіі, што ў двух суб'ектаў, якія ўяўляюць сабой, паводле свайго ўсеагульнага вызначэння, адно і тое самае, пэўнае асаблівае вызначэнне, якое належыць аднаму суб'екту, належыць таксама і іншаму суб'екту.

(a. Шмат якія адзінкавыя прадметы маюць адну і тую ж прыроду.

b. *Адзін з гэтых прадметаў мае пэўную якасць.*

c. Такім чынам, і іншыя таксама маюць гэтую якасць.)

(Пры індукцыі важна, што́ будзе суб'ектам, а што́ — прэдыкатам заключэння; напрыклад, тое, што адвольна рухаецца, ёсць жывёлай; або: жывёла ёсць тым, што адвольна рухаецца. Леў ёсць сысуном; або: сысун ёсць ільвом. Пры аналогіі, наадварот, апасродкаванне палягае ў тым, што іншая адзінкавасць мае тую ж самую ўсеагульную прыроду; у той самы час пры індукцыі прыватная пэўнасць служыць падставай для вызначэння ўсеагульнай прыроды адзінкавага: напр., планета Зямля рухаецца; Месяц ёсць планетай; значыць, Месяц рухаецца.)

*C. Лагічныя высновы дачыненняў*

§ 51

У *катэгарычным* лагічным вывадзе сярэднім тэрмінам ёсць пэўная ў сабе і для сябе існая ўсеагульнасць, або, інакш кажучы, прырода адзінкавага суб'екта, праз якую акурат выяўляецца і злучаецца з гэтым суб'ектам пэўная істотная ўласцівасць.

§ 52

*Гіпатэтычны* лагічны вывад прызнае за падставу аднаго тут-быцця пэўнае іншае тут-быццё. Калі A ёсць, то ёсць і B. Але A ёсць. Такім чынам, ёсць і B. — Вызначэнні тут ужо не дачыняюцца адно да аднаго як адзінкавае, асаблівае і ўсеагульнае; пэўнае вызначэнне, B, якое існуе спачатку толькі ў сабе, інакш кажучы толькі ў магчымасці, тут злучаюць з тут-быццём праз A, якое ўяўляе сабой сярэдні тэрмін і маецца тут у якасці падставы.

§ 53

У *дызʼюнктыўным* лагічным вывадзе падставай дзеля таго, каб злучыць якое-небудзь вызначэнне з пэўным суб'ектам, служыць тое, што з асаблівых вызначэнняў адной і той жа ўсеагульнай сферы нейкая частка гэтаму суб'екту не належыць, а астатнія, такім чынам, належаць, або не ў тым выпадку, калі вызначэнне адлучаюць ад суб'екта, наадварот. — A ёсць або B, або C, або D. Але яно не ёсць ні B, ні C. Значыць, яно ёсць D.

§ 54

Сярэднім тэрмінам, такім чынам, тут ёсць суб'ект як усеагульная сфера ў сваім поўным адасабленні; ён змяшчае выключэнне або пастуляванне пэўнай часткі гэтых вызначэнняў суб'екта. Суб'ект гэтага лагічнага вываду, як штосьці само па сабе ўсеагульнае, ёсць магчымасцю шматлікіх вызначэнняў.

Ад яго ўсеагульнасці, ці магчымасці, робіцца пераход да яго пэўнасці або рэчаіснасці.

§ 55

Агляд формаў лагічнага вываду паказвае, што: 1) у *якасным* лагічным вывадзе моманты дзейсныя ў іх якасным адрозненні. Таму яны маюць патрэбу ў такім апасродкавальным, якое ёсць іх непасрэдным адзінствам, але не супадае з імі; 2) у *колькасных* лагічных вывадах якаснае адрозненне момантаў, а з ім таксама ўзаемадачыненне і адрозненне апасродкаванага і непасрэднага, неістотныя. 3) У лагічных вывадах *дачынення* апасродкаванне змяшчае, у той жа час, і непасрэднасць. Такім чынам, якраз з іх і ўзнікла паняцце непасрэднасці прыроды, г. зн. такой непасрэднасці якаснага адрознення, якая ў сабе і для сябе ёсць адначасова і апасродкаваннем, а менавіта: мэтай і працэсам.

## Другі раздзел
## Рэалізацыя паняцця

§ 56

Як у суджэнні, так і ў лагічным вывадзе паняцце існуе ў непасрэднай рэальнасці, у бессаронннім тут-быцці суб'екта і прэдыката; экстрэмумы лагічнага вываду процістаяць адзін аднаму і сярэдняму тэрміну. *Аб'ектыўна*, аднак, гэтыя моманты самі ў сабе становяцца цэлым, і, такім чынам, іх непасрэднасць палягае якраз у тым, каб быць цэлым.

§ 57

У *мэце* тое, што выступае як наступства і вынік, ёсць адначасова і непасрэднай дзейнай падставай. Як нешта суб'ектыў-

нае мэта адарваная ад вонкавага тут-быцця, і дзейнасць палягае ў пераводзе суб'ектыўнай формы ў аб'ектыўнасць. У гэтым пераходзе мэта адначасова вяртаецца да свайго паняцця.

§ 58

Лагічнаму вываду мэтазгоднага дзеяння ўласцівыя тры моманты: суб'ектыўная мэта, апасродкаванне і тут-бытная мэта. Кожны з гэтых момантаў уяўляе сабой татальнасць усеагульных вызначэнняў лагічнага вываду.

§ 59

1) Суб'ектыўная мэта змяшчае: a) нявызначаную свабодную дзейнасць суб'екта наогул, якая: b) вызначае сама сябе, г. зн. *адасабляе* сваю ўсеагульнасць і надае сабе пэўны змест; c) яна валодае таксама момантам адзінкавасці, у адпаведнасці з якім яна негатыўная ў дачыненні да самой сабе, здымае сваю суб'ектыўнасць і стварае вонкавае, свабоднае ад суб'екта тут-быццё.

§ 60

2) *Апасродкаванне*, або пераход у аб'ектыўнасць, мае ў сабе два бакі: a) бок *аб'ектыўнасці*. У якасці такога вонкавая рэч выступае як сродак, падпарадкаваны ўладзе суб'екта і з прычыны гэтага вызначаны быць сродкам і звернуты супраць вонкавага тут-быцця. b) Бок *суб'ектыўнасці* —гэта апасродкавальная дзейнасць, якая, з аднаго боку, суадносіць сродак з мэтай і падпарадкоўвае яго ёй, а з другога — звяртае сродак супраць іншага і з дапамогай зняцця вызначэнняў вонкавага [быцця] надае мэце тут-быццё.

§ 61

3) *Ажыццёўленая мэта* — гэта: a) тут-быццё аб'ектыўнасці наогул, але: b) не толькі непасрэднае тут-быццё, а і па-

стуляванае і апасродкаванае тут-быццё і: с) з тым самым зместам, што і суб'ектыўная мэта.

§ 62

Недахопам гэтага мэтавага дачынення ёсць непасрэднасць існавання кожнага з трох момантаў, якія ўступаюць у стасункі, дзякуючы чаму дачыненні і вызначэнні, якія яны атрымліваюць у гэтым, прыўносяцца да іх звонку. Таму і ўвесь рух такой рэалізацыі паняцця ўяўляе сабою, уласна кажучы, суб'ектыўнае дзеянне. Рэалізацыяй у якасці *аб'ектыўнага* дзеяння ёсць *працэс* як унутранае дачыненне момантаў лагічнага вываду *адпаведна іх уласнай прыродзе*. Сапраўдныя прадметы суадносяцца ў працэсе як самастойныя экстрэмумы; іх жа ўнутранае вызначэнне палягае ў тым, каб быць апасродкаванымі іншымі, і ў тым, каб злучыцца з імі.

§ 63

1) У чыстым *механізме* прадметы злучаюцца або змяняюцца з дапамогай пэўнай трэцяй сілы, так што іх сувязь або змяненне не існуюць яшчэ загадзя ў іх прыродзе, а ёсць для іх вонкавымі і выпадковымі, таму прадметы тут застаюцца самастойнымі.

§ 64

2) У *хімізме* кожны з двух экстрэмумаў: а) паводле свайго тут-быцця ўяўляе сабой нешта вызначанае і таму істотна процілеглае іншаму, b) як нешта процілеглае іншаму ён *у сабе* ёсць дачынннем да іншага. Ён ёсць не толькі ім самім, але і вызначаны быць абавязкова ў злучэнні з іншым; яго ж прырода напружаная ўнутры сябе і скіраваная да іншага; с) адзінства экстрэмумаў ёсць *нейтральным прадуктам*, які ўтварае аснову іх дачыненняў і іх уступлення ў працэс, аднак

гэтае адзінства прысутнічае ў іх толькі як у сабе існае ў сабе дачыненне. Яно не існуе свабодна для сябе да працэсу. Гэта адбываецца толькі ў мэце.

§ 65

3) Таму вышэйшае адзінства палягае ў тым, што дзейнасць захоўвае сябе ў прадукце або ў тым, што *сам прадукт прадукуе*; такім чынам нейтралізацыя момантаў ёсць таксама іх раздваеннем, або знікненне працэсу ў аб'яднанні экстрэмумаў ёсць яго новым узнікненнем. Дзейнасць гэтага прадукавальнага прадукта ёсць, такім чынам, *самазахаваннем*. Ён стварае сябе, г. зн. стварае тое, што ўжо існуе.

## Трэці раздзел
## Вучэнне аб ідэях

§ 66

*Ідэя* — гэта нешта аб'ектыўна сапраўднае або адэкватнае паняцце, у якім тут-быццё вызначана яго ўласцівым яму паняццем, і існаванне як прадукавальны сам сябе прадукт знаходзіцца ў вонкавым адзінстве са сваёй мэтай. Ідэя — гэта тая рэчаіснасць, якая адпавядае не нейкаму існаму па-за ёй уяўленню або паняццю, а свайму ўласнаму паняццю; гэтая рэчаіснасць таму ёсць такою, якой яна павінна быць у сабе і для сябе, і сама ўтрымлівае ўнутры сябе гэтае сваё паняцце. *Ідэал* — гэта ідэя, якая разглядаецца з боку яе *існавання*, але такая, якая адпавядае паняццю. Такім чынам, кожная рэчаіснасць у сваёй найвышэйшай праўдзе ёсць ідэалам. У адрозненне ад слова «ідэал», «ідэяй» называюць хутчэй нешта сапраўднае, якое разглядаецца з боку яго *паняцця*.

§ 67

Існуюць тры ідэі: 1) ідэя жыцця, 2) ідэя пазнання і дабра і: 3) ідэя навукі або самой праўды.

*І. Ідэя жыцця*

§ 68

Жыццё — гэта ідэя ў сваім непасрэдным тут-быцці, з прычыны чаго яна якраз уступае ў абсяг з'яў, г. зн. зменлівага, шматстайнага і вонкава вызначальнага быцця і процістаіць неарганічнай прыродзе.

§ 69

Жыццё як непасрэднае адзінства паняцця і тут-быцця ўяўляе сабою такое цэлае, часткі якога існуюць не самастойна, а дзякуючы цэламу і ўсярэдзіне цэлага, прычым цэлае сапраўды гэтак жа сама існуе дзякуючы часткам. Жыццё — гэта *арганічная сістэма.*

*ІІ. Ідэя пазнання і дабра*

§ 70

У гэтай ідэі паняцце і рэчаіснасць разыходзяцца. З аднаго боку, паняцце, у адрыве ад рэчаіснасці пустое, павінна атрымаць сваё вызначэнне і ажыццяўленне праз рэчаіснасць; з іншага боку, рэчаіснасць замест самастойнага вызначэння павінна атрымаць сваё вызначэнне ад паняцця.

*1) Пазнанне*

§ 71

Пазнанне — гэта суаднясенне паняцця і рэчаіснасці. З'яўляючыся само па сабе напоўненым толькі сабой і *ў гэтым сэнсе* пустым, мысленне дзякуючы пазнанню напаўняецца асаблівым зместам, які ад тут-быцця ўзвышаецца да ўсеагульнага ўяўлення.

§ 72

Дэфініцыя прадмета, які выступае ўнутры яе як нешта адзінкавае або асаблівае, выказвае 1) яго *гатунак* як яго *ўсеагульную* сутнасць і 2) асаблівую дакладнасць гэтага ўсеагульнага, дзякуючы якой усеагульнае і ёсць гэтым прадметам.

§ 73

*Падзел* гатунку або ўсеагульнасці наогул выказвае род, парадак і да т. п. яго *адасабленняў*, у якіх гатунак існуе, як разнастайнасць *відаў*. Гэтыя адасабленні, якія змяшчаюцца ў пэўным адзінстве, павінны выцякаць з якой-небудзь агульнай падставы падзелу.

§ 74

Пазнанне часткова аналітычнае, часткова сінтэтычнае.

§ 75

*Аналітычнае* пазнанне зыходзіць з паняцця або якога-небудзь канкрэтнага вызначэння і развівае толькі разнастайнасць непасрэдных або простых, якія тоесна ў ім змяшчаюцца, вызначэнняў.

§ 76

*Сінтэтычнае* пазнанне, наадварот, развівае вызначэнні цэлага, якія не ўтрымліваюцца ў ім непасрэдна, не выцякаюць тоесна адно з аднаго, а ў дачыненні адно да аднаго маюць кшталт адрознення; такое пазнанне паказвае неабходнасць вызначанага стасунку гэтых вызначэнняў адно да аднаго.

§ 77

Гэта адбываецца праз *пабудову* і *доказ*. Пабудова выяўляе паняцце або тэзу часткова ў іх рэальных вызначэннях,

а часткова дзеля патрэбаў доказу яна выяўляе гэтую іх рэальнасць у яе падзеле і раскладанні, дзякуючы чаму і пачынаецца пераход гэтай рэальнасці ў паняцце.

§ 78

*Доказ* збірае раскладзеныя часткі і, параўноўваючы іх стасункі паміж сабой, злучае іх гэтак, што апошняе ўтварае выказаны ў пастулаце стасунак цэлага; або доказ выяўляе, як існуюць рэальныя вызначэнні, што ёсць момантамі паняцця, і як іх стасунак у падсумаваным выглядзе выяўляе паняцце ў яго татальнасці.

§ 79

У такім пазнанні (у сваёй найбольш строгай форме яно ёсць геаметрычным) гаворка ідзе пра тое, што: 1) пабудова не выцякае з паняцця, а ёсць штучнай канструкцыяй, якая выяўляе сваю мэтазгоднасць толькі ў дачыненні з доказам; у іншых жа выпадках яно ёсць таксама эмпірычным апісаннем; 2) да аналітычных вызначэнняў у доказ якім-небудзь чынам уводзяць ужо вядомыя, загадзя створаныя сінтэтычныя прынцыпы, і матэрыял доказу падводзіцца пад іх і злучаецца з іх дапамогай. Дзякуючы гэтаму доказ атрымлівае выгляд выпадковасці, прычым гэта неабходна толькі для разумовага разгляду і не выяўляе ўласнага руху і ўнутранай неабходнасці самога прадмета.

*2) Павіннасць або дабро*

§ 80

У ідэі пазнання шукаюць паняцце, і яно павінна адпавядаць прадмету. У ідэі дабра, наадварот, паняцце лічыцца чымсьці першым і ў сабе існай мэтай, якая *павінна* быць рэалізавана ў рэчаіснасці.

§ 81

Дабро само ў сабе, паколькі яно толькі павінна рэалізавацца, процістаіць пэўнаму не адпаведнаму яму свету і прыродзе, якая мае свае ўласныя законы неабходнасці і абыякавая да законаў свабоды.

§ 82

Дабро як абсалютная мэта, з аднаго боку, павінна быць ажыццёўлена ў сабе, без ніякага стаўлення да наступстваў, бо яно даручана рэчаіснасці, якая існуе незалежна ад яго і *якая можа скажаць* яго.

§ 83

Разам з тым, тут ужо закладзена вызначэнне, што *сама па сабе* рэчаіснасць *супадае* з дабром, г. зн. вера ў маральнае светаўладкаванне.

*III. Ідэя ведання або праўды*

§ 84

Абсалютнае веданне — гэта паняцце, якое мае прадметам і зместам само сябе і якое, такім чынам, ёсць сваёй уласнай рэальнасцю.

§ 85

Шлях, або *метад*, абсалютнага ведання ёсць аднолькава як аналітычным, так і сінтэтычным. Разгортванне таго, што ўтрымліваецца ў паняцці, аналіз, уяўляе сабою выяўленне розных вызначэнняў, якія ўтрымліваюцца ў паняцці, але не дадзены непасрэдна як такія, і, такім чынам, адначасова яны сінтэтычныя. Выяўленне паняцця ў яго рэальных вызначэннях вынікае тут з самога паняцця, і тое, што ў звычайным пазнанні ўтварае доказ, тут ёсць вяртаннем

момантаў паняцця, што перайшлі ў адрозненне, да адзінства, якое ёсць дзякуючы гэтаму *татальнасцю*, напоўненым і пераўтвораным у свой уласны змест паняццем.

§ 86

Гэтае апасродкаванне паняцця самім сабой ёсць не толькі *працэсам суб'ектыўнага пазнання*, але ў такой жа ступені — і *ўласным рухам самой рэчы*. У абсалютным пазнанні паняцце гэтак жа сама мае пачатак, як яно ёсць і вынікам.

§ 87

Узыходжанне да далейшых паняццяў, або да пэўнага новага абсягу, гэтак жа сама абумоўленае папярэднімі паняццямі і неабходнае. Паняцце, якое стала рэальнасцю, ёсць, разам з тым, пэўным адзінствам, якое павінна выяўляць рух рэалізацыі ў сабе. Але развіццё працілегласці, што ўтрымліваецца ў гэтым адзінстве, не ёсць простым раскладаннем на моманты, з якіх паняцце ўзнікла, а тыя маюць цяпер іншы кшталт у выніку таго, што яны прайшлі праз адзінства. У новым развіцці яны цяпер пастуляваныя як тое, што яны ёсць, дзякуючы іх узаемадачыненню. Такім чынам, яны атрымалі новае вызначэнне.

# ДРУГІ АДДЗЕЛ
# ФІЛАСОФСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

## Уводзіны

§ 1

Энцыклапедыя павінна разглядаць усё кола навук, характарызуючы прадмет кожнай з іх і яго асноўнае паняцце.

§ 2

Разнастайнасць высноў адносна якога-небудзь усеагульнага прадмета, падсумаваная ў адзінстве ўсеагульных уяўленняў, і думкі, якія ўзнікаюць пры разглядзе сутнасці гэтага прадмета, утвараюць, калі іх злучыць адну з адной, асаблівую навуку.

§ 3

Калі ў падмурку гэтага злучэння знаходзіцца эмпірычны матэрыял, з якога яна здабывае пэўную толькі падсумавальную для яго ўсеагульнасць, тады навука мае пераважна *гістарычны* характар. Калі, аднак, усеагульнае папярэднічае яму ў выглядзе асноўных вызначэнняў і паняццяў і ўсё асаблівае трэба выводзіць з яго, тады навука пераважна мае, уласна кажучы, больш *навуковы* характар.

§ 4

Не існуе абсалютнай мяжы для кола ведаў, якое павінна складаць асаблівасць пэўнай навукі, бо кожны ўсеагульны або канкрэтны прадмет можна падзяліць на яго віды або часткі і кожны такі від зноў разглядаць як прадмет асаблівай навукі.

§ 5

У *звычайнай* энцыклапедыі навукі апісваюцца эмпірычна — так, як яны існуюць. У ёй яны павінны быць пададзены ў поўным выглядзе і, апроч таго, прыведзены ў такі парадак, калі ўсё падобнае і тое, што падпадае пад адны і тыя ж вызначэнні, ставіцца побач у адпаведнасці з аналагічным сваяцтвам.

§ 6

*Філасофская* энцыклапедыя ёсць, аднак, навукай пра неабходныя, вызначаныя паняццем узаемасувязі і філасофскае паходжанне асноўных паняццяў і прынцыпаў навук.

§ 7

Гэта, уласна кажучы, выклад усеагульнага зместу філасофіі, бо тое, што ў навуках заснавана на розуме, залежыць ад філасофіі; тое ж, што заснаванае ў іх на адвольных і вонкавых вызначэннях, г. зн. ёсць, як яго называюць, пазітыўным і статутарным, а таксама ўсё чыста эмпірычнае знаходзіцца па-за яе межамі.

§ 8

Навукі, паводле спосабу пазнання, бываюць або *эмпірычнымі*, або *чыста рацыянальнымі*. Разгляданыя абсалютна, як тыя, так і другія павінны мець адзін і той самы змест. Мэта навуковых памкненняў палягае ў тым, каб усё вядомае чыста эмпірычна ўзвысіць да заўсёдна праўдзівага, да паняцця, зрабіць рацыянальным і тым самым уключыць у склад рацыянальнай навукі.

§ 9

Навукі *пашыраюцца* часткова ў эмпірычным плане, часткова ў рацыянальным. Апошняе адбываецца тады, калі

істотнае вылучаюць усё больш і больш, успрымаюць яго ў аспекце ўсеагульнасці і спасцігаюць чыста эмпірычнае. Рацыянальнае пашырэнне навук — гэта, разам з тым, і пашырэнне самой філасофіі.

§ 10

Сукупнасць навукі падзяляецца на тры галоўныя часткі: 1) *логіку*, 2) навуку *аб прыродзе*, 3) навуку *аб духу*. — Логіка ёсць менавіта навукай аб чыстым паняцці і абстрактнай ідэі. Прырода і дух складаюць рэальнасць ідэі, першая — як вонкавае тут-быццё, другі — як той, што ведае сябе. (Інакш кажучы: лагічнае ёсць вечна простай сутнасцю ў сабе самім; прырода ёсць гэтая самая сутнасць як адчужаная (entäußert); у той час як дух ёсць вяртаннем гэтай сутнасці ў сябе са свайго адчужэння.)

§ 11

Навукі аб прыродзе і духу, у адрозненне ад чыстай навукі, або логікі, можна разглядаць як *ужытковыя* (*прыкладны́я*) навукі, як сістэму *рэальных*, або *асаблівых*, навук, бо яны ўяўляюць сабой сістэму чыстай навукі ў кшталце прыроды і духу.

## Першая частка
## Логіка

§ 12

Логіка — гэта навука аб чыстай развазе і чыстым розуме, аб уласцівых ім вызначэннях і законах. У адпаведнасці з гэтым, усё лагічнае мае тры бакі: 1) абстрактны, або развагавы; 2) дыялектычны, або негатыўна-разумовы; 3) спекулятыўны, або пазітыўна-разумовы. *Развażлівае* трымаецца паняццяў

у іх непарушнай дакладнасці і адрознасці; *дыялектычнае* паказвае гэтыя паняцці ў іх пераходзе і ў іх ператварэнні адно ў адно; *спекулятыўнае*, або *разумнае*, ахоплівае адзінства паняццяў у іх процілегласці або пазітыўнае — у яго раскладанні і пераходзе.

§ 13

Развага і розум звычайна бяруцца пры гэтым у суб'ектыўным сэнсе, у той меры, у якой яны як мысленне належаць якой-небудзь самасвядомасці, і логіка выступае тады як чыста *фармальная* навука, якая найперш мае патрэбу ў іншым змесце, у вонкавым матэрыяле, дзеля таго, каб магло здзейсніцца што-кольвечы напраўду праўдзівае.

§ 14

Згодна са сваім зместам логіка разглядае, з аднаго боку, развагу і розум у сабе і дзеля саміх сябе, а з другога — абсалютнае паняцце як у сабе і для сябе сапраўдную аснову ўсяго, або, інакш кажучы, логіка разглядае разважнае і разумнае, паколькі яно ёсць не толькі свядомым разуменнем. Таму логіка ў сабе самой — гэта спекулятыўная філасофія, бо спекулятыўны спосаб разгляду рэчаў ёсць не чым іншым, як разглядам сутнасці рэчаў, якая ў той самай меры ёсць чыстым, уласцівым розуму паняццем, як прырода і закон рэчаў.

§ 15

Логіка распадаецца на тры часткі: 1) на *онталагічную* логіку; 2) на *суб'ектыўную* логіку; 3) на *вучэнне аб ідэях*. Першая — гэта сістэма чыстых паняццяў існага; другая — сістэма чыстых паняццяў усеагульнага; трэцяя частка змяшчае паняцце навукі.

# Першы раздзел
# Анталагічная логіка

## *І. Быццё*
## *А. Якасць*

### *a) Быццё*
### § 16

Пачаткам навукі ёсць непасрэднае, пазбаўленае вызначэнняў паняцце *быцця*; 2) апошняе паводле сваёй беззместоўнасці ўяўляе сабой тое самае, як і *нішто*. Нішто, як мысленне такой пустаты, такім чынам, само ёсць быццём і дзеля сваёй чысціні — такім самым быццём, як і першае; 3) такім чынам, паміж быццём і нічым няма адрознення; тое, што ёсць, ёсць толькі размяшчэннем іх як адрозных і зніканнем кожнага з іх у яго процілегласці, г. зн. толькі чыстым *станаўленнем*.

### *b) Тут-быццё*
### § 17

Але, паколькі ў станаўленні размешчаныя раней быццё і нішто толькі знікаюць, тое станаўленне ёсць іх супольным падзеннем у спакойную прастату, у якой яны не ёсць нічым, але і не існуюць ужо кожны для сябе, а як знятыя, г. зн. моманты. Гэтае адзінства ёсць *тут-быццём*.

### § 18

Тут-быццё — гэта: 1) быццё, у паняцці якога як дачыненне да іншага або як *быццё для іншага* заключаны таксама і яго нябыт; 2) аднак паводле свайго моманту быцця, яно валодае таксама бокам не толькі быцця як дачынення да іншага, а і быцця-*для-сябе*. Як паняцце, якое ахоплівае абодва гэтыя вызначэнні, яно ёсць *рэальнасцю*.

§ 19

*Рэальнае*, або *нешта*, як адрознае ад іншага рэальнага, напачатку абыякавае да яго, бо ў сваёй іншабытнасці яно разам з тым ёсць у сабе. Адрозненне аднаго нешта ад іншага спачатку палягае ў *мяжы* як сярэдзіне паміж імі, у якой яны прысутныя з той меры, як і адсутныя.

§ 20

Такія *нешта*: 1) адрозніваюцца ад мяжы або сваіх адрозненняў, якія ёсць іх сярэдзінай, па-за якой яны ёсць нечым. Але: 2) сама мяжа належыць ім самім, бо ёсць *іх мяжою*.

§ 21

Такім чынам, адрозненне — гэта: 1) уласнае адрозненне рэальнасці, або яе *вызначанасць*. Аднак гэтая ў сабе існая вызначанасць ёсць таксама: 2) вонкавым тут-быццём або *станам*. Вызначанасць, якая ёсць як вонкавай, так і ўнутранай, утварае *якасць*.

*c) Змяненне*

§ 22

Стан, або вонкавае тут-быццё, гэтак жа сама прыналежыць нечаму, як і чужое яму; прытым ён ёсць яго іншабытнасцю і тым самым яго нябытам. Ён, такім чынам, ёсць яго няроўнасцю з самім сабой, дзякуючы чаму пастуляваная *змена*.

§ 23

У той час як змена ёсць адмаўленнем адмоўнага, якое мае нешта ў ім, узнікла *для-сябе-быццё*. Інакш кажучы, вызначанасць як унутранае адрозненне, якое мае нешта ў сабе

самім, ёсць дачыненнем нечага ў яго адрозненні толькі да самога сябе: або яно ёсць для сябе.

*В. Колькасць*

*а) Для-сябе-быццё (ідэальнасць)*

§ 24

Для-сябе-быццё ёсць: 1) адрознасцю, але толькі ад самога сябе, або дачыненнем не да іншага, а да самога сябе; 2) але паколькі адрознасць змяшчае ў сабе іншабытнасць, а дачыненне да апошняга адмоўнае, то *для* яго існуе і іншае, але як выключанае.

§ 25

Для-сябе-існае ўяўляе сабой лікавае *адно*. Адно — простае, аднесенае толькі да сябе, і з яго выключана іншае. Яго іншабытнасць ёсць *множнасцю*.

§ 26

Шмат хто — гэта кожнае, адно і тое самае. Таму яны — гэта адно. Але такое адно ёсць сапраўды гэтак сама і множнасцю. Бо тое, што яно выключае, ёсць яго процілегласцю, або, інакш кажучы, яно выяўляе сябе тым самым як мноства. Першае станаўленне ёсць *прыцягненнем*, другое — *адштурхоўваннем*.

§ 27

Калі пастулявана і адно, і другое станаўленне, то іх праўдай ёсць спакой, які ёсць і быццём-па-за-сабой аднаго, або пастуляваннем самога сябе як множнасці, *стрыманасцю* як сабе самому роўным дачыненнем шмат каго, або іх *бесперапыннасцю*, чыстай *колькасцю*.

*b) Абмежаваная колькасць (Quantum)*

§ 28

У колькасці негатыўнасць аднаго прысутнічае толькі як знятая, або, паколькі ў роўнасці сабе самому для-сябе-быцця іншабытнасць не ёсць непасрэдна нечым іншым, толькі вонкавай мяжой, або мяжой, якая зусім не ёсць мяжой. Колькасць з такой абыякавай мяжой — гэта *абмежаваная колькасць*.

§ 29

Абмежаваная колькасць ёсць *экстэнсіўнай колькасцю*, калі мяжа аднесена да моманту множнасці колькасці; або яна ёсць *інтэнсіўнай колькасцю* — калі мяжа аднесена да моманту роўнасці-самой-сабе, або яна заключана ў вызначэнні роўнасці-самой-сабе.

§ 30

Паколькі адмоўнасць ёсць абыякавай мяжой для абмежаванай колькасці, то для-сябе-быццё, або абсалютнае вызначэнне, ёсць для яе *тагасветнасцю*. Таму можна выйсці па-за межы любой абмежаванай колькасці і пакласці іншую мяжу, але і гэтая іншая мяжа сапраўды гэтак жа сама не можа быць іманентнай мяжой. Дзякуючы гэтаму ўзнікае *паступальны рух у бясконцасць, або кепская бясконцасць*.

§ 31

Аднак абсалютнае вызначэнне, пакладзенае як тагасветнасць, як для-сябе-быццё, ёсць і ўласным момантам колькасці. Інакш кажучы, мяжа, якая не ёсць мяжой, уяўляе сабой толькі знятую ў для-сябе-быцці іншабытнасць. Гэтая іншабытнасць ёсць вызначанасцю, пастуляванне якой ёсць самавызначэннем: [гэта] *якасная велічыня*.

*С. Бясконцасць*

§ 32

Якасная велічыня як простае вызначэнне ёсць найперш *спецыфічнай* велічынёй, а як самавызначальнасць, праз якую яна адрознівае сябе, аднак, ёсць спецыфікацыяй велічыняў, якія адначасова вызначаныя велічыні ў дачыненні адна да адной і знаходзяцца ў стасунках якасці адна да адной, або ёсць іх паказчыкам лікавага стасунку і ў якасным плане больш адносяцца адна да адной. Паколькі велічыні тут не толькі знятыя як канчатковыя, а сама іх знятасць сама пастуляваная як іх якасны закон, гэта ёсць іх сапраўднай, актуальнай бясконцасцю.

*II. Сутнасць*

*А. Паняцце сутнасці*

§ 33

Простае ўзаемнае пранікненне колькаснага, або вонкавага, вызначэння і ўласнай унутранай вызначанасці ёсць сутнасцю. Як пранікненне самавызначэння і бесстаронняй вызначанасці яна мае ў сабе моманты *істотнасці* і *неістотнасці*. Істотнае тое, што належыць самавызначэнню, неістотны, аднак, момант бесстаронняга тут-быцця.

§ 34

Станаўленне як станаўленне сутнасці ёсць перш за ўсё дзеяннем, пераходам сутнасці ў свабоду тут-быцця; але пераход гэты ёсць усё ж знаходжаннем унутры сябе.

§ 35

Паколькі дзеянне ёсць адрозніваннем сутнасці ад самой сябе, дзякуючы чаму ўзнікае тут-быццё, або вызначанасць, то дзеянне ёсць пастуляваннем.

*B. Прынцып*

§ 36

Прынцып змяшчае ў сабе момант знаходжання ўсярэдзіне сябе, або роўнасці з самім сабой, а таксама момант чыстай адрознасці. Першы —гэта чыстая *матэрыя*, другі — чыстая *форма*. Чыстая форма, аднак, ёсць дзеяннем, якое застаецца ўсярэдзіне сябе, г. зн. той самай роўнасцю з самою сабой, якая была названа чыстай матэрыяй; у той жа час, чыстая матэрыя ўяўляе сабой пазбаўленую адрозненняў нявызначанасць, і яна не адрозная ад чыстай формы.

§ 37

Аднак адрознасць павінна быць пастуляваная, і адзінства формы і роўнасці з самім сабой знаходзіцца ў процілегласці да ўнутры-сябе-быцця ў форме вонкавага тут-быцця, і гэта тое, што звычайна называюць *матэрыяй*. У той меры, у якой яна існуе ў форме ўнутранага быцця, яна ёсць *зместам*, формай жа ёсць кожнае з такіх вызначэнняў адрознасці.

§ 38

α) Просты прынцып — гэта *прынцып тоеснасці*, a=a. Тоеснасць бесстаронняя што да сваёй матэрыі. Яе змест не мае ніякага вызначэння, г. зн. яна беззмястоўная, і, такім чынам, яе форма ёсць пазбаўленай адрозненняў роўнасцю з самою сабой.

§ 39

β) *Прынцып бесстаронняга адрознення* наогул пастулюе нявызначаную адрознасць і сцвярджае, што не існуе двух рэчаў, якія былі б абсалютна роўныя.

§ 40

γ) *Прынцып процiпастаўлення* абвяшчае: a ёсць або b, або не-b, *дадатнасцю* і *адмоўнасцю*. З двух процілеглых

прэдыкатаў рэчы належыць толькі адзін, і паміж імі няма нічога трэцяга.

§ 41

б) *Прынцып падставы* выяўляе вяртанне пастуляванага ў сябе, або, інакш кажучы, само пастуляванне як нешта трэцяе, у чым знятыя процілеглыя вызначэнні, і што, як прастата, ёсць вызначэннем, процілеглым абгрунтаванаму, што ўяўляецца разнастайным тут-быццём.

*C. Падстава і абгрунтаванне*

**1. Цэлае і часткі**

§ 42

Як падстава свайго тут-быцця, без якога няма і самой сутнасці, сутнасць — гэта перш за ўсё *цэлае* і *часткі*. Цэлае ёсць яднаннем сваіх частак, і, наадварот, яно складаецца са сваіх частак. Абодва бакі ўтвараюць сабой адно і тое самае. Цэлае роўна часткам у іх сукупнасці, г. зн. іх цэлым; гэтак жа сама часткі роўныя цэламу ў яго падзеленасці, г. зн. як яго часткам; або, інакш кажучы, абодва бакі абыякавыя адзін да аднаго, а дзейнасць цэлага як формы мае за сваю ўмову матэрыю.

**2. Сіла і яе выяўленне**

§ 43

Аднак часткі ёсць часткамі, толькі тады, калі яны злучаныя ў цэлае. Цэлае, г. зн. дачыненне частак, ёсць вызначанасцю праз адзінства падставы. Інакш кажучы, якасць тут-быцця вызначаецца дзейнасцю падставы як формы, і матэрыя з'явы ёсць уласным зместам формы. Такім чынам, падстава — гэта *сіла*, якая выяўляе сябе.

§ 44

Сіла — гэта самапастуляванне свайго тут-быцця як вызначанай якасці. Дзякуючы таму, што тут-быццё ёсць, разам з тым, і быццём для іншага, або вонкавасці, сіла адначасова вольная ад яго і не знішчаецца, калі тут-быццё, г. зн. яе з'ява, знікае. У адпаведнасці з гэтым бокам сіла хоць і не ёсць больш матэрыяй, якая ўтварае яе змест і складае яе іманентную прыналежнасць, але ўсё ж абумоўліваецца якой-небудзь дзейнасцю, што выклікае яе.

§ 45

Такая дзейнасць, якая выклікае, сама ёсць сілай, і, значыць, у сваю чаргу павінна быць выклікана. Паколькі дачыненне абедзвюх дзейнасцяў адна да адной ёсць узаемным абменам іх вызначэнняў, то кожная з іх ёсць падставай для дзеяння або выяўленнем іншай дзейнасці. Такім чынам, узнікае паняцце падставы, якое служыць падставай сваёй уласнай дзейнасці і іншай, якая ўзбуджае гэтую дзейнасць.

**3. Вонкавае і ўнутранае**

§ 46

Сутнасць як сама сябе ўзбуджальная дзейнасць ёсць падставай свайго тут-быцця, і ў яе тут-быцці няма нічога чужога і наогул нічога такога, што не было б пастулявана самой падставай. Такім чынам, сутнасць і яе тут-быццё — гэта адно і тое самае. Унутраная сутнасць ставіцца да сябе як вонкавай, а гэта вонкавае ёсць толькі выразам унутранага.

§ 47

Знаходзячыся ў такім стасунку падстава ёсць чымсьці безумоўным, унутраным, адзінствам матэрыі як спа-

чывальнай роўнасці самой сабе і формы як адзінства процілеглага. Падстава ў сваім тут-быцці выяўляе сябе як матэрыя, у якой сілы спачываюць, і як процілегласць сябе, і як гульня ўзбуджальных датычна сябе і дзейных у дачыненні адна да адной сіл. Сутнасць тым самым зрабілася *рэчаіснасцю*.

## *III. Рэчаіснасць*

§ 48

Рэчаіснасць ёсць самастойным стасункам. Яна валодае момантам свайго выяўлення, або тут-быцця, якое ёсць стаўленнем да самога сябе, і яе магчымасці, быцця-самога-па-сабе, або сутнасці свайго тут-быцця. Сама рэчаіснасць — гэта адзінства сваёй магчымасці і свайго тут-быцця.

### 1. Субстанцыя

§ 49

Рэчаіснае — гэта *субстанцыя*. Яно ёсць сутнасцю, што змяшчае ўнутры сябе вызначэнні свайго тут-быцця як простыя атрыбуты і законы, пастулюючы іх як гульню сіл тут-быцця або як свае акцыдэнцыі, зняццё якіх азначае не знікненне субстанцыі, а яе вяртанне ў самае сябе.

§ 50

Субстанцыя ёсць неабходнасцю сваіх акцыдэнцый. У сваім вольным наяўным быцці апошнія паводле сваёй прыроды дачыняюцца да іншага як да чагосьці ўнутранага, схаванага ў іх; пры гэтым і падаецца, што яны страцілі сваю самастойнасць праз вонкавы выпадак і чужую сілу, але ў сапраўднасці гэта — толькі аднаўленне цэлага, якое зноў прымае ўнутр сябе створанае ў ім адасабленне.

**2. Прычына**

§ 51

Субстанцыя ўступае ў стасунак прычыннасці, паколькі яна выяўляе процілегласць неабходнасці. Субстанцыя — гэта вольна дзейная абсалютная прычына, не толькі як рухальны пачатак, дзейнасць якога пачынаецца ўнутры яго самога, але і як пачатак, які мае ўнутры сябе таксама ўвесь згаданы змест, які атрымлівае сваё тут-быццё ў форме ўздзеяння.

§ 52

Гэтая дзейнасць, у адпаведнасці з процілегласцю паміж дзейнасцю і зробленым, уяўляе сабой пераход у процілегласць, аднак паводле зместу гэты пераход ёсць тоесным пераходам.

**3. Узаемадзеянне**

§ 53

Таму субстанцыя, як прычына дзейная толькі ў датычна самой сябе і ўнутры самой сябе, знаходзіцца толькі ўва ўзаемадзеянні з самою сабой, або, інакш кажучы, яна выступае як усеагульнае.

## Другі раздзел
## Суб'ектыўная логіка

*І. Паняцце*

§ 54

*Паняцце* — гэта цэлае вызначэнняў, зведзенае ў іх простае адзінства.

§ 55

Яно мае моманты ўсеагульнасці, асаблівасці і адзінкавасці.

§ 56

Усеагульнасць — гэта ягонае ўнутры сябе існае адзінства ў вызначэнні. Асаблівасць ёсць негатыўнай як простае вызначэнне, прасякнутае ўсеагульнасцю, або, інакш кажучы, яна ёсць прыкметай. — Адзінкавасць ёсць негатыўнай як чыстая негатыўнасць, што дачыняецца сама з сабой.

§ 57

Адзінкавасць мае вызначэнне як негатыўнасць, якая дачыняецца сама з сабой, пазбаўленая вызначэнняў ў выглядзе абыякавага, аднак не самастойнага, а знятага тут-быцця ў ёй як уласцівасцю, і яна ёсць *суб'ектам*.

*II. Суджэнне*

§ 58

Суджэнне — гэта адлучэнне суб'екта ад яго вызначэння, або асаблівасці, і дачыненне яго з апошняй, якое ўяўляе сабой яго прэдыкат. Суб'ект і прэдыкат суадносяцца адзін з адным або як адзінкавае і асаблівае, або як адзінкавае і ўсеагульнае, або як асаблівае і ўсеагульнае.

§ 59

Суджэнне адначасова і пашырае суб'ект да ўсеагульнасці, і абмяжоўвае яго. Тым самым прэдыкат адначасова і выходзіць па-за межы суб'екта, і ўтрымліваецца ў гэтым суб'екце, або, інакш кажучы, прэдыкат адначасова ёсць і нечым асаблівым, і нечым усеагульным.

*а) Якасць суджэння, або вызначэнне прэдыката*

§ 60

Паколькі суджэнне — гэта дачыненне прэдыката з суб'ектам, то 1) змест і выяўленне суджэння напачатку перш

за ўсё наступнае: адзінкавае ёсць пэўным усеагульным; *пазітыўнае* суджэнне. — 2) Адзінкавае тым не менш не ёсць усеагульным — *негатыўным* — суджэннем, а асаблівым. — 3) Адзінкавае не ёсць асаблівым, *бясконцым* суджэннем — гэтым суджэннем здымаецца любое вызначэнне, а таксама ўсеагульная сфера і, такім чынам, прэдыкат наогул.

*b) Колькасць суджэння, або вызначэнне суб'екта*

§ 61

Бясконцае суджэнне змяшчае адзінкавае як адзінкавае або, інакш кажучы, як *вось гэта*, у выніку чаго ўзнікае: 1) суджэнне: вось гэта такое; *сінгулярнае* суджэнне; — 2) паколькі прэдыкат, у той жа час, выказвае пра суб'ект і нешта ўсеагульнае, то суджэнне павінна быць такім: *пэўнае такое*; *партыкулярнае* суджэнне, у якім непасрэдна заключана і процілеглае суджэнне: пэўнае не такое; 3) гэтая нявызначанасць здымаецца з дапамогай суджэння: *усё* такое; *універсальнае* суджэнне.

*c) Адносіны суджэння, або вызначэнне дачынення*

§ 62

Якасным і колькасным суджэннем як суб'ект, так і прэдыкат ужо пастуляваныя ўва ўсіх вызначэннях паняцця, дзякуючы гэтаму ў наяўнасці паняцце *ў сабе* і суджэнне змяшчае цяпер дачыненне пэўнага тут-бытнага з паняццем. Гэтае ўва ўласным сэнсе слова суджэнне ёсць: 1) *катэгарычным*. Але паколькі згаданае дачыненне паняцця з тут-быццём уяўляе сабой адно толькі ўнутраную ўзаемасувязь, то катэгарычнае суджэнне ёсць разам з тым толькі *асертарычным*.

§ 63

2) *Гіпатэтычнае* суджэнне — калі ёсць а, то ёсць і b — выяўляе ўзаемасувязь як такую, г. зн. без гарантыі, або

сцвярджэння, яе тут-быццё, у сувязі з чым гэтае суджэнне *праблематычнае*.

§ 64

3) *Дызʼюнктыўнае* суджэнне — а ёсць або b, або c, або d — утрымлівае ў прэдыкаце ўсеагульнасць і адасабленне яе. Субʼект дачыняецца з гэтымі вызначэннямі таксама як усеагульнасць у той меры, у якой вызначэнні ўсеагульнага выключаюць адно аднаго, і субʼекту можа належаць толькі адно з іх. Гэтае суджэнне *ападыктычнае*.

*III. Лагічны вывад*

§ 65

Лагічны вывад — гэта выяўленне паняцця ў яго момантах. Наколькі адзінкавасць, асаблівасць і ўсеагульнасць розныя тут як моманты, настолькі ж экстрэмумы злучаныя з дапамогай сярэдняга тэрміна, які ўяўляе сабой іх адзінства.

§ 66

Лагічны вывад — гэта 1) перш за ўсё злучэнне адзінкавасці і ўсеагульнасці з дапамогай *асаблівасці*, узятай у якасці сярэдняга тэрміна. Сэнс такога лагічнага вываду наступны: a) любое адзінкавае дзякуючы сваёй вызначанасці ёсць нечым усеагульным, або, інакш кажучы, яно мае тут-быццё наогул; b) любое адзінкавае дзякуючы сваёй непасрэднай вызначанасці мае яшчэ і іншую вызначасць, якую першая ўключае ў сябе.

§ 67

Форма лагічнага вываду, Адз. — Ас. — Ус., ёсць агульным правілам *падвядзення* вызначанага зместу пад усеагульнае вызначэнне. Калі ўсеагульнае вызначэнне, як гэта бывае ў тоесных выказваннях, не ёсць паводле зместу

больш агульным за тое, пра якое яно непасрэдна выказваецца, то яно мае ўсё ж форму ўсеагульнасці ў якасці прэдыката, у той час як другое ёсць суб'ектам.

§ 68

У колькасных вызначэннях моманты лагічнага вываду не знаходзяцца адзін з адным у стасунку формы, а ў стасунку роўнасці. Таму *матэматычны* лагічны вывад абвяшчае: тое, што роўна нечаму трэцяму, роўна паміж сабой.

§ 69

Усе лагічныя вывады, якое б становішча ні займалі моманты, якія змяшчаюцца ў іх, могуць быць зведзеныя да той вышэйзгаданай формы, якая ёсць агульным правілам усіх лагічных вывадаў.

§ 70

У лагічным вывадзе, калі яго разглядаць паводле вызначаных момантаў, сярэднім тэрмінам ёсць асаблівасць — адна з мноства вызначанасцяў, уласцівых адзінкаваму як канкрэтнаму; гэтю адзінкавасць можна спалучыць і з іншымі ўсеагульнымі вызначэннямі, якія могуць узаемна абмяжоўваць і нават скасоўваць адно аднаго. — Якраз гэтак сама і асобна ўзятую асаблівасць можна суаднесці з іншымі ўсеагульнымі вызначэннямі. Са свайго боку, ўсеагульнае змяшчае ў сабе і іншыя вызначанасці, а тым самым і іншыя адзінкавасці. Такім чынам, адзінкавае і злучанае з ім усеагульнае тут ёсць адно для аднаго выпадковым зместам.

§ 71

Што да дачынення гэтых момантаў, то ў лагічным вывадзе маюцца два непасрэдныя дачыненні, або суджэнні,

а менавіта: дачыненне адзінкавага з асаблівым і дачыненне асаблівага з усеагульным, і адно апасродкаванае дачыненне — заключэнне. Паколькі толькі апасродкаванае дачыненне ўтрымоўвае адзінства злучаных момантаў, а дзякуючы гэтаму, паводле формы, і неабходнасць іх дачынення, то абодва непасрэдныя дачыненні таксама трэба паказаць як апасродкаванні. Калі ж гэта рабіць з дапамогай лагічных вывадаў таго ж самага віду, то ўзнікае паступальны рух у дрэнную бясконцасць, прычым кожны з такіх дадатковых лагічных вывадаў мае той самы дэфект.

## § 72

Такім чынам, непасрэдныя дачыненні адзінкавага з асаблівым і асаблівага з усеагульным трэба раней апасродкаваць паводле ўсеагульнай формы лагічнага вываду наогул, але праз нейкую іншую вызначанасць сярэдняга тэрміна.

2) Таму другі ўсеагульны лагічны вывад акурат у тым і палягае, што асаблівае злучаюць з усеагульным праз *адзінкавасць*. — Але адзінкавае як нешта тут-бытнае, каб быць сярэднім тэрмінам, павінна быць узята як *цэласнасць*: лагічны вывад шляхам *індукцыі*. Паколькі ж тут-бытнае адзінкавае належыць неабмежаванай выпадковасці, індукцыя не можа быць поўнай, і таму індуктыўны лагічны вывад у гэтым сэнсе недасканалы, і гэтак жа сама ён не ўтрымлівае ў сабе ўнутранай неабходнасці.

## § 73

Тым не менш, адзінкавасць, узятая ў якасці сярэдняга тэрміна, у той меры, у якой яна ёсць *ўсеагульным* момантам паняцця, злучае асаблівае і ўсеагульнае праўдзівым чынам. Яна ўяўляе сабой такое негатыўнае адзінства, у якім, як станаўленне і дзейнасць, асаблівасць як адрозная разнастайнасць

і як умова тут-быцця злучана ў адно і ўзнята да простага ўсеагульнага адзінства, або, наадварот, усеагульнае раз'яднана на адзінкавасці і ўступіла ў разнастайнасць тут-быцця.

§ 74

3) Урэшце, трэба апасродкаваць дачыненне адзінкавасці з асаблівасцю, дзеля чаго ў нашым распараджэнні маецца ўсеагульнае: лагічны вывад *па аналогіі*. У гэтым лагічным вывадзе сярэдні тэрмін проціпастаўляе экстрэмуму асаблівасці вызначэнне адзінкавасці і распадаецца на *адзінкавае* і *ўсеагульнае*, бо тое, што з поўным правам можна выказаць толькі пра адзінкавае, бярэцца тут як усеагульнае. Гэты лагічны вывад, такім чынам, утрымлівае, уласна кажучы, чатыры вызначэнні (quaternio terminorum) і таму нездавальняльны.

§ 75

Але *ўсеагульнасць* як праўдзівы сярэдні тэрмін ёсць унутранай прыродай і цэлым паняццем, у якім негатыўнае адзінства, суб'ектыўнасць, гэтаксама як і аб'ектыўнасць, змест і асаблівасць тут-быцця ўзаемна пранікаюць адно ў адно, і ўсеагульнасць тут ёсць абсалютнай падставай і ўзаемасувяззю быцця-ўнутры-сябе і тут-быцця.

§ 76

Першы лагічны вывад Адз. — Ас. — Ус., г. зн. лагічны вывад апасродкавання адзінкавасці і ўсеагульнасці праз асаблівасць, мае *на ўвазе* абодва наступныя лагічныя вывады, з дапамогай якіх апасродкуюцца абодва яго непасрэдныя дачыненні. Са свайго ж боку, абодва гэтыя лагічныя вывады маюць на ўвазе як адно аднаго, так і першы. Непасрэднае патрабуе апасродкавання і вынікае толькі з яго; гэтак як і наадварот: апасродкаванне вынікае з непасрэднага. Гэтыя лагічныя вывады

ўтвараюць кола ўзаемных перадумоў, якое як цэлае звязаны сам з сабой і падводзіць да сябе як да цэнтральнага пункта ў простым апасродкаванні, якое ў той жа меры непасрэднае.

§ 77

Гэтае цэлае апасродкавання, якое мае на ўвазе само сябе і ў той жа час ёсць простай непасрэднасцю, дае пачатак тут-быццю, якое мае сваёй перадумовай тую прычыну і яе дзейнасць; але ж і наадварот: створанае ёсцьпадставай дзейнасці і самога акту тварэння. Таму гэтае *апасродкаванне* не ёсць ані *пераходам*, як станаўленне быцця наогул, дзе пераходнае губляецца ўва ўласным проціпастаўленні, ані *актам тварэння* як *праявай* падставы, якая бывае толькі непасрэднай, ані *выяўленнем навонкі* сілы, чыя дзейнасць абумоўлена, ані *ўздзеяннем*, як дзеянне прычыны, дзейнасць якой знікае ў выніку.

§ 78

А. *Мэта* пры бліжэйшым разглядзе ёсць рэальным паняццем, якое само сябе рэалізуе і ёсць поўным лагічным вывадам як цэлае, так і ў сваіх частках. Спачатку яна як суб'ектыўная мэта ёсць поўным лагічным вывадам, а менавіта: 1) непасрэднай унутры сябе існай усеагульнасцю, якая: 2) сама сябе вызначае або адасабляецца і: 3) імкнецца да выхаду па-за сябе, да тут-быцця.

§ 79

B. *Рэалізацыя* мэты гэтак жа сама ёсць поўным лагічным вывадам. Гэтае апасродкаванне ёсць: 1) дзейнай мэтай як дзейснай прычынай, якая: 2) з дапамогай сродку, які часткова належыць суб'ектыўнаму і ставіцца дзейнасцю ў сувязь з мэтай, а часткова належыць тут-быццю або аб'ектыўнасці

і ставіцца дзейнасцю ў сувязь з гэтай аб'ектыўнасцю, 3) уздзейнічае на непасрэднае тут-быццё і праз зняццё апошняга дае самому сабе апасродкаваную створаную аб'ектыўнасць.

§ 80

С. Гэтая аб'ектыўнасць, *ажыццёўленая* мэта выяўляе апасродкаванне праз усеагульнае. Яна — гэта нешта вонкавае, што, з аднаго боку, ёсць прадуктам, а з другога — падставай акту тварэння. У ёй дзейснае настолькі ж выйшла па-за сябе і перайшло ў сваю процілегласць, наколькі вярнулася з апасродкавальнай дзейнасці ўнутр сябе і ў сваёй іншабытнасці знайшло толькі само сябе.

§ 81

У той меры, у якой мэта як дзейная прычына ў існаванні дазваляе раздзяліцца сродку і прадукту, сродак, такім чынам, не мае ў сабе мэты, а прадукт — дзейнасці, мэтазгоднасць бывае толькі *вонкавай* і *адноснай*; яна наогул існуе толькі ў той меры, у якой мэта сама мае падпарадкаваны змест і тое, што ёсць для яе сродкам, з якога-небудзь боку дачыняецца з ёй.

§ 82

Мэта існага палягае ў тым, што яно ёсць у сабе і ў сапраўднасці, або яна ёсць у яго паняцці. Таму адносная мэтазгоднасць, якая лічыцца толькі з якой-небудзь з вызначанасцяў існага, не вычэрпвае яго паняцця.

§ 83

*Унутраная мэтазгоднасць* палягае ў тым, што нешта ёсць у самім сабе ў аднолькавай меры як мэтай, так і сродкам, як сваім прадуктам, а прадукт — самім, што прадукуе. Гэткае і ёсць *самамэтай*.

## Трэці раздзел
## Вучэнне аб ідэях

§ 84

Ідэя — гэта адэкватнае паняцце, у якім суб'ектыўнасць і аб'ектыўнасць роўныя, або дзе тут-быццё адпавядае паняццю як такому. Яна ўключае ў сябе сапраўднае жыццё самасці. Ідэя — гэта збольшага жыццё, збольшага пазнанне, збольшага навука.

*I. Ідэя жыцця*

§ 85

Жыццё — гэта ідэя ў стыхіі тут-быцця. Дзякуючы адзінству паняцця і аб'ектыўнасці жывое ёсць такім цэлым, часткі якога самі па сабе нішто, але існуюць толькі з дапамогай цэлага і ўнутры цэлага, г. зн. уяўляюць сабой *арганічныя часткі*, дзе матэрыя і форма — непарыўнае адзінства.

§ 86

Жыццю ў сабе ўласцівыя ўсеагульныя моманты, якія якраз таксама і ствараюць усеагульную арганічную сістэму; яно мае: 1) у сваёй вонкавасці сваё ўсеагульнае простае ўнутры-сябе-быццё, *адчувальнасць*; 2) узбуджальнасць, стымуляваную звонку, і непасрэднае процідзеянне вонкаваму, *раздражняльнасць*; 3) вяртанне ўнутр сябе гэтага ўздзеяння навонкі, *рэпрадукаванне*.

§ 87

Як самарух у працэсе рэалізацыі жыццё ўяўляе сабой патройны працэс: 1) *фарміраванне* індывіда ўнутры сябе самога; 2) яго *самазахаванне* ў адносінах да яго неарганічнай прыроды; 3) захаванне *роду*.

§ 88

1) Працэс *фарміравання* ёсць стасункам арганічнага да сябе самога і палягае ў тым, што арганічныя часткі пастаянна і ўзаемна ствараюць адна адну, прычым захаванне адной з іх залежыць ад захавання іншых. Гэтае ўзаемастварэнне арганічных частак ёсць, з аднаго боку, эвалюцыяй наяўнай у сабе арганізацыі, а з другога — пастаянным яе змяненнем. Гэты просты *рост*, г. зн. колькаснае змяненне — гэта, аднак, не працэс павелічэння праз супастаўленне, г. зн. механічнае павелічэнне, а ён ёсць працэсам павелічэння праз *інвагінацыю*.

§ 89

Працэс арганічнага *змянення* ў найменшай ступені ёсць хімічным працэсам. У хімізме матэрыі, што маюць стасункі адна з адной, хоць і ўзаемна злучаны паняццем (хімічнае падабенства) і *ў сабе* ўжо ўтрымліваюць свой прадукт; аднак апошні не робіць сябе наперад як нешта дадзенае і сабе роўнае. Аднак яго стварэнне не ёсць самазахаваннем. Таму ён толькі нейтральны прадукт, г. зн. такі прадукт, у якім згасла дзейнасць, якая належыць асобным матэрыям; ён не ёсць самаўзнаўляльным і зноў можа быць падзелены як якасна, так і колькасна на свае складнікі.

§ 90

Наадварот, арганічны *працэс сілкавання* ёсць дасканалым вызначэннем матэрыяльнага павелічэння праз унутраную, ужо існую форму, якая як суб'ектыўнае або як простая форма ўсіх частак стасуецца сама з сабой, або кожная з частак паасобку стасуецца з астатнімі як з аб'ектыўным і знаходзіцца ў працэсе толькі сама па сабе.

§ 91

2) *Працэс самазахавання* арганічнага перад абліччам яго неарганічнай прыроды. — Вольнае проціпастаўленне жыцця як суб'ектыўнага і аб'ектыўнага выяўляе сябе як арганічная і неарганічная прырода. Апошняя ёсць жыццём без індывідуальнасці, дзе адзінкавае існуе для сябе, мае сваё паняцце толькі як закон натуральнай неабходнасці, а не ў суб'ектыўнай форме, і атрымлівае сваё значэнне толькі ў цэлым. Гэтым цэлым як суб'ектам ёсць арганічнае, з якім істотна дачыняецца і ўтварае ўмову апошняй неарганічная прырода.

§ 92

Неарганічная *ўмова* стасуецца з арганічнай не як прычына або хімічны момант, а як тое, што закладзена ў арганічным уздзеяннем неарганічнага, што само істотна вызначана арганічным і дзейнічае толькі *ўзбуджальным чынам*. Арганічнае — гэта падвоены рух пастаяннага змагання, рух, які, з аднаго боку, спыняе стыхійнае станаўленне і пераход у процілегласць, а таксама здымае сваю ўмову і індывідуалізуе аб'ектыўную ўсеагульнасць, а з другога боку, выключае з сябе самога індывідуальнае або суб'ектыўнае і апускае сябе да неарганічнага тут-быцця.

§ 93

3. Працэс *захавання роду* ёсць: а) рэалізацыяй роду наогул, які як усеагульнае жыццё пераходзіць праз адасабленне віду да рэчаіснасці ў адзінкавым, да індывідуальнасці; b) стасункам арганічнага з роўным яму арганічным, з дапамогай чаго яно стварае сябе як іншага індывіда таго самага роду, што выяўляецца ў змене індывідаў і зваротным шляху адзінкавасці да ўсеагульнасці.

### *II. Ідэя пазнання*

§ 94

Пазнанне — гэта выяўленне прадмета паводле такіх яго тут-бытных вызначэнняў, якія ўтрымоўваюцца ў адзінстве яго паняцця і вынікаюць адтуль, або, наадварот, у той меры, у якой уласная дзейснасць паняцця дае сабе яго вызначэнні. Гэтыя вызначэнні, пастуляваныя як змешчаныя ў паняцці, і ёсць пазнаннем або ідэяй, якая рэалізуе сябе ў стыхіі мыслення.

### *III. Абсалютная ідэя, або веданне*

§ 95

Абсалютнае веданне: 1) не мае сваім прадметам нічога вонкавага, якім-кольвечы спосабам дадзенага; яго прадмет толькі яно само. Яно ёсць паняццем, якое існуе як паняцце. 2) Паняцце канструюе сябе з сябе самога, бо яно існуе як станаўленне і выяўляе процілегласць, змешчаную ў ім, у форме розных асобна існых рэальных, або развагавых, вызначэнняў. 3) Калі рэальныя вызначэнні становяцца развагавымі вызначэннямі галоўным чынам у сваёй рэфлексіі, то іх дыялектыка паказвае іх не толькі як тыя, што істотна дачыняюцца адно з адным, але і як тыя, што пераходзяць у іх адзінства. З іх гэтага негатыўнага руху вынікае іх пазітыўнае адзінства, якое ўяўляе сабой паняцце ў яго рэальнай татальнасці.

# Другая частка
# Навука аб прыродзе

§ 96

Прырода — гэта абсалютная ідэя ў кшталце іншабытнасці ўвогуле, у выглядзе абыякавай, вонкавай прадметнасці і канкрэтнага, індывідуалізаванага ажыццяўлення сваіх момантаў; інакш кажучы, прырода — гэта абсалютная сутнасць

у вызначэнні непасрэднасці наогул насуперак свайму апасродкаванню. Станаўленне прыроды — гэта станаўленне яе духам.

§ 97

Прыроду варта разглядаць як сістэму прыступак, якія неабходна ўзнікаюць адна з адной, але не так, што адна натуральным шляхам стварае іншую, а ўва ўнутранай ідэі, што ляжыць у падставе прыроды. Рух ідэі прыроды палягае ў тым, каб са сваёй непасрэднасці сысці ў сябе, зняць сябе самую і зрабіцца духам.

§ 98

Прыродазнаўства разглядае: 1) ідэальнае тут-быццё прыроды як прастору і час наогул, 2) неарганічную прыроду, 3) арганічную прыроду і, адпаведна гэтаму, яно ўяўляе сабой: 1) матэматыку, 2) фізіку неарганічнага свету, 3) навуку аб арганічнай прыродзе.

## Першы раздзел
## Матэматыка

§ 99

Прастора і час — гэта тут-бытныя абстракцыі: інакш кажучы, чыстая форма, чыстае сузіранне прыроды; *прастора* ёсць тут-бытнай думкай аб усеагульнай абыякавай адрознасці наогул; *час* — гэта тут-бытная думка аб негатыўным адзінстве, аб чыстым станаўленні.

§ 100

Прастора і час бясконцыя, г. зн. *бязмежныя* ў абстрактнай бесперапыннасці свайго быцця-па-за-сабой. Але як ідэі яны

маюць ўнутры саміх сябе вызначэнні, якія выяўляюць паняцце ў яго момантах, — *вымярэнні*.

§ 101

1) *Вымярэнні прасторы* — гэта такія моманты прасторы, якія не існуюць па-за межамі адзін аднаго; дзе ёсць адзін з іх, там і астатнія. І прытым яны ствараюць фармальныя адрозненні: першы, другі і трэці — як адзінства гэтых адрозненняў. Аднак дзеля бяз'якаснага адзінства прасторы яны не вызначаныя датычна адзін аднаго, а ёсць толькі пустымі адрозненнямі, якія толькі ў сувязі з якім-небудзь дадатковым прадметам атрымліваюць чужую ім самім вызначанасць.

§ 102

2) *Вымярэнні часу* — гэта: 1) *мінулае*: як знятае тут-быццё, як не тут-бытнае; 2) *будучыня*: не тут-быццё, але вызначанае стаць тут-бытным; 3) *сучаснасць* як непасрэднае станаўленне і злучэнне двух першых.

§ 103

Паколькі прастора існуе ў вызначэнні рэальнага, абыякавага тут-быцця, то і межы ў ім рэальныя, а яго вымярэнні, якія спачатку ўяўляюць сабой проста *кірункі* наогул, служаць *формамі* гэтага *яго абмежавання*.

§ 104

Абмежаванню прасторы належыць толькі абыякавае вызначэнне колькасці. *Бесперапынная* велічыня, якая найперш ёсць відам яго колькасці наогул, сама ўяўляе сабой нявызначанае вызначэнне. Абсалютная вызначанасць уласцівая *дыскрэтнай* велічыні, прынцыпам якой ёсць *Адно*.

§ 105

Прастора ёсць прадметам пэўнай (сінтэтычнай) навукі, *геаметрыі*, бо ў ёй, як такой, любая бесперапынная вызначаная колькасць можа *схематызаваць* сябе, г. зн. выявіць сябе наглядна, а таксама праз тое, што ў ёй як стыхіі абыякавай, асобна тут-бытнай разнастайнасці, якая, аднак, разам з тым бесперапынная, паняцце прадмета выяўляе сябе ў сваім рэальным кшталце, які змяшчае штосьці большае за істотнае вызначэнне гэтага паняцця.

§ 106

Час як такі, аднак, не здольны быць дасканалай схемай, або *фігурай вызначанай колькасці*. Праз сваё неспакойнае станаўленне час не ёсць стыхіяй сінтэтычнага цэлага. Робячыся пэўнай колькасцю, ён пераходзіць у негатыўнае колькаснае вызначэнне, у Адно, якое складае прынцып (аналітычнай) навукі аб колькасцях, *арыфметыкі*, бо сувязь Аднаго не ёсць уласна элементарным сузіраннем рэальнасці; сувязь гэтая такая, якой яна бывае пастуляваная.

§ 107

У арыфметыцы і ў геаметрыі параўноўваюцца адна з адной такія вызначаныя колькасці, якія пры ўсёй адвольнасці і ўсеагульнасці іх велічынь расцэньваюцца ўсё ж згодна з гэтым іх вызначэннем, якое належыць ім незалежна ад іх стасункаў адна з адной, як цалкам або, лепш сказаць, самі па сабе вызначаныя колькасці, як *канечныя велічыні*. *Аналіз* бясконцасці, і ў першую чаргу дыферэнцыяльнае і інтэгральнае злічэнне, разглядае *бясконцыя велічыні*, г. зн. такія велічыні, якія ўжо не маюць значэння канечных або зусім самастойна вызначаных велічынь, а ёсць *знікальнымі велічынямі*, якія атрымліваюць сваё значэнне толькі ў іх

*лімітавых суадносінах*, або на *іх мяжы*, г. зн. выключна ў суадносінах.

§ 108

*Дыферэнцыяльнае злічэнне* знаходзіць для формулы выраз лімітавых суадносінаў яе зменных, канечных велічынь. *Інтэгральнае злічэнне*, наадварот, шукае канчатковы выраз для формул, якія змяшчаюць лімітавыя суадносіны.

§ 109

*Прыкладнбя* (*ужытковая*) матэматыка ўжывае чыстую матэматыку да стасункаў велічынь прыроды, якія бяруцца ёю з досведу.

## Другі раздзел
## Фізіка

### *I. Механіка*

§ 110

Чыстае сузіранне, якое перайшло са сваёй непасрэднасці да быцця-ў-сабе-і-для-сябе або, інакш кажучы, напоўненая прастора і час — гэта матэрыя. Неспакой прасторы і быццё-ўнутры-сябе часу, пастуляваныя абсалютна ў Адно, даюць паняцце матэрыі наогул.

§ 111

Адпаведна моманту быцця-ўнутры-сябе матэрыя была б адасобленым *пунктам*; адпаведна моманту быцця-па-за-сабой яна была б мноствам узаемвыключальных *атамаў*. Але паколькі апошнія, выключаючы адзін аднаго, тым самым дачыняюцца адзін з адным, то атам не мае рэчаіснасці, і атамістычнае,

гэтак жа як і абсалютная бесперапыннасць, або бясконцая падзельнасць, уяўляюць сабой у матэрыі толькі магчымасць.

§ 112

Матэрыя, узятая як існая для сябе, мае момант адасобленасці, уласцівай, аднак, гэтак жа сама матэрыі як быцці-ў-сабе, і гэта толькі пэўная істотная бесперапыннасць, *цяжар*, што ўтварае ўсеагульны прэдыкат цела, якое і ёсць матэрыяй у форме суб'екта.

§ 113

Цела ўтрымлівае ў сабе дачыненне ідэальных момантаў прасторы і часу, якое выяўляе сябе як *рух*, а цяжар — як падставу апошняга.

§ 114

*Свабодны* рух уласцівы целам, якія маюць унутры свой уласны *цэнтр* цяжару. Дзякуючы сувязі такіх цэнтраў узнікае свабодная сістэма *кругавога* руху нябесных цел; іншыя целы, наадварот, не маючы ўласнага цэнтра, пазбаўленыя адцэнтрабежнай сілы і падпарадкоўваюцца дацэнтравай сіле, з прычыны чаго яны *падаюць*.

§ 115

Момантам велічыні руху, акрамя прасторы і часу, ёсць *маса*; прастора і час таксама пераходзяць у сілу і гэтак, як маса, ёсць момантамі сілы.

*II. Фізіка неарганічнага свету*

§ 116

Індывідуалізаваны і раскладаны на якасныя адрозненні *святлом* цяжар — гэта канкрэтная або, лепш сказаць, фізічная прырода і прадмет фізікі наогул.

§ 117

Цяжар — гэта процілегласць быцця-па-за-сабой, якое толькі *імкнецца* да быцця-ўнутры-сябе. Матэрыя і ёсць гэтым тут-быццём імкнення, чыя процілегласць выяўляецца толькі ў момантах прасторы і часу, у пэўным чыста ідэальным цэнтры. Згаданаеператварэнне быцця-па-за-сабой у быццё-ўнутры-сябе, простае інтэнсіўнае адзінства цяжару ёсць пэўным тут-быццём, якое процістаіць яму, свабодна існай самасцю матэрыі, *святлом*. Святло як сабе самому роўнае быццё-ўнутры-сябе ёсць прынцыпам індывідуалізацыі і адасаблення матэрыі. Яго дачыненне з яго чыстым адмаўленнем, з цемрай, утварае *колер*.

§ 118

Першым момантам асаблівага тут-быцця фізічнай прыроды ёсць *магнетызм*, раздваенне пункта індывідуальнага адзінства на процілегласць, якая, аднак, яшчэ застаецца заключанай у паняцці.

§ 119

Другім момантам ёсць рэалізацыя, а менавіта вызваленне і асаблівае канстытуяванне бакоў процілегласці: 1) у якасці *электрычнасці*, якая ўяўляе сабой яшчэ неўрэчаўлёную, мімалётную праяву гэтай процілегласці, што палягае ў абсалютнай напружанасці яе бакоў датычна адзін аднаго; 2) у якасці *элементарных хімічных рэчываў*. Яны ёсць якаснымі адрозненнямі цялеснасці і існуюць у кшталце ўласных матэрый, якія, аднак, яшчэ абстрактныя і не маюць сапраўднай індывідуальнасці; 3) у якасці *фізічных цел*, у якіх якасныя вызначэнні існуюць усярэдзіне канкрэтнай цялеснасці; такія целы хоць і ўтрымоўваюць у сабе ўсе моманты цялеснасці, але пад вызначэннем якога-небудзь аднаго з гэтых момантаў,

або якасцяў, і прымаюць датычна адно да аднаго кшталт абыякавага, устойлівага існавання: a) як *фізічныя элементы*, b) як абсалютныя або *нябесныя целы* і: c) як *зямныя целы*, якія перайшлі да далейшага падзелу і раз'яднання.

§ 120

Трэцім момантам ёсць *хімічны працэс*. Раз'яднанасць і ўласнае абыякавае адасобленае існаванне цел ёсць, разам з тым, і дачыненнем гэтых цел адно да аднаго, не толькі ўзаемнай напругай, але і ўзаемным проціпастаўленнем і натхненнем да дзейнасці і ўздзеяння, дзякуючы чаму іх абыякавае існаванне здымаецца і прыводзіцца назад да адзінства татальнасці. Гэты зваротны працэс у жывой прыродзе супадае, аднак, з працэсам канструявання, у выніку чаго злучэнне, з іншага боку, становіцца тут разам з тым выбыццём і асяданнем якога-небудзь абыякавага існавання.

## Трэці раздзел
## Фізіка арганічнага свету

§ 121

*Геалогія* разглядае будову зямлі як вынік згаслага працэсу ўтварэння зямнога індывіда. *Геагназія* разглядае гэтую будову з пункту погляду агульнасці яго горных парод паводле іх структуры, варункаў залягання і, разам з *арыктагназіяй*, якая разглядае пераважна асобныя ўтварэнні як часткі агульнай будовы зямлі, а таксама жылавыя пароды, складае *мінералогію*.

§ 122

*Раслінная* прырода ўяўляе сабой пачатак працэсу самазахавання або сапраўды арганічнага працэсу, які робіцца

індывідуальным, або, інакш кажучы, суб'ектыўным, які, аднак, не мае яшчэ поўнай сілы індывідуальнага адзінства, прычым расліна, адзін індывід, мае толькі такія часткі, якія таксама можна лічыць самастойнымі індывідамі. З прычыны гэтай недастатковасці ўнутранага адзінства расліна і не дасягае здольнасці адчуваць. *Фізіялогія раслін* разглядае іх усеагульную прыроду, а *батаніка* — іх сістэму, у якой падраздзяленне раслін заснавана галоўным чынам на адрозненнях органаў апладнення, што і ёсць той найвышэйшай праявай расліннага жыцця, дзякуючы якой расліны мяжуюць з больш высокай ступенню арганізма.

§ 123

*Жывёльная* прырода мае тое суб'ектыўнае адзінства, дзякуючы якому ўсе арганічныя часткі падпарадкаваны цэламу, што ўяўляе сабой нешта Адно. *Фізіялогія* жывёльнага арганізма разглядае *функцыі* гэтых частак, якія не толькі спрыяюць пастаяннаму спараджэнню цэлага, але гэтак жа спараджаюцца і захоўваюцца дзякуючы гэтаму працэсу. — *Параўнальная анатомія* вывучае ўсеагульны *тып* жывёлы ў розных утварэннях ўсеагульнага роду; з аднаго боку, яна даследуе, як гэты тып пачынае выяўляцца ў жывёл найпрасцейшай арганізацыі і паступова выступае ўсё больш і больш развітым, з другога боку, як ён мадыфікуецца адпаведна розным стыхіям, у якіх паўстаюць перад намі жывёльныя віды. *Заалогія* класіфікуе віды жывёл паводле іх галоўных агульных прыкметаў і бярэ ў якасці вызначэння для гэтага галоўныя ступені развіцця жывёльнага тыпу, стыхію, а таксама зброю ў стасунку да іншых, прычым, аднак, тыя пэўныя межы, якія тут спачатку атрымліваюцца, прырода сцірае дзякуючы пераходам, якія злучаюць адзін прынцып з іншым.

§ 124

Арганізм з прычыны моманту сваёй раздражняльнасці ў агульным і цэлым дачыняецца са сваёй неарганічнай прыродай. Разрыў гэтага дачынення існуе спачатку суб'ектыўна ўнутры самога арганізма як адчуванне недахопу, як *патрэба*. Гэты суб'ектыўны разрыў рэфлексуе сябе навонкі ў процілегласць паміж арганічнай і неарганічнай прыродай. Неарганічныя патэнцыі паводзяць сябе датычна арганізма як *узбуджальныя*, а яго дзейнасць — гэта пастаяннае змаганне за тое, каб у меру сваёй успрымальнасці ўвабраць іх у сябе, а там пераадолець іх і тым самым аднавіць у сабе адзінства, якое якраз і ёсць такім рухам узаемнай процілегласці ўнутраных сістэм ды іх аднаўленнем.

§ 125

Арганізм апынаецца ў стане *хваробы*, калі якая-небудзь закладзеная ў ім патэнцыя, перастаўшы падпарадкоўвацца яму, ператвараецца ў сістэму, якая дзякуючы гэтаму замыкаецца ў сабе, упарта трымаецца сваёй уласнай дзейнасці і не пераходзіць ужо ў плаўную дзейнасць цэлага, у выніку чаго ўвогуле перапыняе арганічны працэс. Навукай аб хваробах і іх лячэнні ёсць *медыцына*.

§126

Жывёла валодае *адчуваннем*, паколькі яе арганічныя моманты захоўваюць сваё вызначэнне і свой сэнс толькі ў адзінстве жыцця, але разам з тым яны маюць яшчэ і вонкавае пазавызначанае быццё. Апошняя рэфлексія гэтай вонкавасці ў абстрактны элемент прастаты, які адзін толькі і ўтварае паўнату існавання момантаў, ёсць узвышэннем да духу.

# Трэцяя частка
# Навука аб духу

§ 127

Дух толькі пачынае з вонкавага, вызначае яго, а ў далейшым мае стасунак толькі да сябе самога і да сваіх уласных вызначэнняў.

§ 128

Філасофія духу змяшчае тры раздзелы. Яна разглядае: 1) дух у ягоным паняцці, псіхалогію наогул; 2) рэалізацыю духу і: 3) завяршэнне духу ў мастацтве, рэлігіі і навуцы.

## Першы раздзел
## Дух у ягоным паняцці

§ 129

Дух, які разглядаецца сам па сабе: 1) павінен быць зразуметы ў сваім *натуральным тут-быцці*, у сваёй непасрэднай сувязі з арганічным целам і ў сваёй узрушвальнай адсюль залежнасці ад афекцый і станаў цела; займаецца гэтым *антрапалогія*; 2) у якасці таго, які з'яўляецца, а менавіта, паколькі ён у якасці суб'екта дачыняецца да ўсяго іншага як аб'екта, дух ёсць *свядомасцю* і прадметам *фенаменалогіі духу*; 3) як дух, узяты адпаведна вызначэнням яго дзейнасці ўнутры сябе самога, ён ёсць прадметам *псіхалогіі*.

(Паколькі вызначэнні, змешчаныя пад пунктамі 1 і 2, падчас нашых заняткаў ужо знайшлі сваё асвятленне ў іншым месцы, то тут будзе выкладзена толькі псіхалогія.)

§ 130

Інтэлект пачынае з вонкавага свету як са сваёй *умовы*, а не як са свайго прынцыпу, якім для яго ёсць, уласна кажучы, ён сам. Ён: 1) непасрэдны ў якасці *пачуцця*, змест якога ён: 2) узвышае ўнутры сябе да *ўяўлення*, а: 3) у якасці *мыслення* ён ачышчае гэты змест ад выпадковасці да неабходнасці і ад асаблівасці да ўсеагульнасці яго вызначэнняў.

*I. Пачуццё*

§ 131

Пачуццё — гэта простая, але ўсё ж вызначаная афекцыя адзінкавага суб'екта, у якім яшчэ не ўсталявалася адрозненне суб'екта і зместу; інакш кажучы, пачуццё ёсць вызначэннем, выкліканым у суб'екце, які яшчэ як бы не адлучыўся ад аб'екта.

§ 132

Пачуццё бывае часткова ўнутраным, часткова вонкавым і непасрэдным, яшчэ да рэфлексіі, гэтак як настрой бывае прыемным або непрыемным.

*II. Уяўленне*

§ 133

Пачуццё ёсць тым першапачатковым, яшчэ прыхаваным унутры сябе матэрыялам, які інтэлект узвышае да ўяўлення праз тое, што яна здымае ўласцівую пачуццю форму прастаты і раз'ядноўвае пачуццё на нешта аб'ектыўнае і нешта суб'ектыўнае, якое адлучаецца ад гэтага аб'ектыўнага, ператвараючы пачуццё ў нешта *адчутае*.

§ 134

Спачатку *прадмет* існуе толькі ўва ўяўленні. Ступені ўяўлення палягаюць у тым, *што* інтэлект: 1) *узгадвае*, паколькі

ён наогул адлучае сябе ад зместу пачуцця; 2) *уяўляе сабе* гэты змест, утрымліваючы яго без ягонага аб'екта, свабодна выклікае яго самога з сябе і злучае; 3) пазбаўляе яго непасрэднага значэння і *дае* яму *ў памяці* іншае значэнне ды іншае злучэнне.

*А. Успамін*

§ 135

1) *Сузіранне* ёсць непасрэдным уяўленнем, у якім вызначэнні пачуцця пераўтвораныя ў адлучаны ад суб'екта прадмет, што не залежыць, і разам з тым залежыць, ад адзінкавага суб'екта. Аднак гэтак жа сама ён залежыць не ад яго як адзінкавага суб'екта, а ад *усіх разам*.

§ 136

*Аб'ект* пастуляваны па-за суб'ектам і ў сабе самім ёсць недастатковасцю, г. зн. часткова спакойнай прасторай побач, часткова неспакойным станаўленнем у паслядоўнасці часу. *Прастора* і *час* — гэта абстрактнае сузіранне, аабо ўсеагульныя формы сузірання.

§ 137

У гэтых усеагульных аб'ектыўных элементах аб'ект, акрамя таго, што ён валодае зместам вызначэнняў пачуцця, ёсць, разам з тым, адзінкавым, суцэльна вызначаным у прасторы і часе і звязаным з іншымі прадметамі да яго, *нароўні* з ім і *пасля* яго.

(Гэтай вызначанасцю ў часе і прасторы і ўзаемазвязанасцю паводле сваіх вызначэнняў рэчы злоўленыя і заключаныя ўва ўсеагульную вязніцу.)

§ 138

2) *Уяўленне*. Пачуццё становіцца аб'ектыўным у сузіранні. Суб'ект, пагружаны ў сузіранне, знаходзіцца ў непасрэдным

дачыненні з ім, так што ў сузіранні, уласна кажучы, ён не мае яшчэ ніякага іншага быцця, акрамя згаданага аб'ектыўнага, прасторавага і часавага быцця. Свабодная дзейнасць інтэлекту палягае тут ува *ўвазе* да шматстайнага тут-быцця *сучаснага* і ў *адвольным выбары* таго, каб спыняцца на нейкім змесце або пераходзіць да іншага — *здольнасць спасціжэння*.

§ 139

Але сузіранне адначасана ёсць аб'ектам *для суб'екта*. Гэты апошні, як у сабе і для сябе існы, вяртае сябе са свайго быцця-па-за-сабой, рэфлексуе сябе ўнутр сябе і адлучае сябе ад аб'ектыўнасці тым, што ён суб'ектыўна ператварае сузіранне ў *вобраз*.

§ 140

Сузіранне, перанесенае ўнутр *Я*, ужо не проста вобраз: яно становіцца *ўяўленнем наогул*. Пры гэтым не бывае, каб сузіранне, успрынятае ўва ўнутраны свет, засталося цалкам адпаведным непасрэднаму сузіранню; наадварот, яно вызваляецца ад сваёй прасторавай і часавай узаемасувязі і вымаецца з яе. Цяпер яно ўяўляе сабой знятае, г. зн. гэткае самае *няіснае*, у якасці *захаванага* тут-быцця.

§ 141

У якасці ўяўлення сузіранне ёсць *уласным* часам і *ўласнай* прасторай суб'екта, перанесенымі ў прастору і час як ува *ўсеагульныя формы*. Дзякуючы зняццю асаблівага часу сузірання яно становіцца *пастаянным*, а дзякуючы зняццю яго асаблівай прасторы яно *паўсюднае*.

§ 142

У далейшым канкрэтнае сузіранне захоўваецца ў сваіх разнастайных вызначэннях або, інакш кажучы, у сваім

адзінстве, але сапраўды гэтак жа і вызваляецца ад путаў сваёй адзінкавасці. Частковыя вызначэнні распадаюцца і робяцца абстракцыямі, якія можна ўяўляць сабе як *існыя самі па сабе* без той пачуццёвай узаемасувязі, у якой яны ўпершыню явіліся суб'екту.

§ 143

3) *Успамін*. Уяўленне як *узгаданае*, або зробленае ўсеагульным, сузіранне стасуецца з непасрэдным сузіраннем гэтак жа сама, як усё пастаяннае і ўсеагульнае з адзінкавым. Успамін не столькі ёсць параўнаннем двух адзінкавых сузіранняў, колькі прычынай таго, што існае цяпер адзінкавае сузіранне падводзіцца пад сузіранне, ужо зробленае ўсеагульным, або пад уяўленне. *Таясамасць*, якую я пазнаю пры гэтым, ёсць, з аднаго боку, тоеснасцю іх *зместу*; а з іншага боку, у існым цяпер сузіранні я пазнаю тоеснасць *мяне* з самім сабой, або ў ім я ўспамінаю *сябе*.

§ 144

Вобраз, або ўяўленне, ператвараецца ў нешта ўсеагульнае не з прычыны таго, што адно і тое ж сузіранне *паўтараецца часта* і гэтыя шматлікія сузіранні альбо неяк больш свядома, альбо так, што пры кожным адзінкавым сузіранні ўспамінаецца папярэдняе, зліваюцца ў Адзін больш-менш абстрактны вобраз: сузіранне атрымлівае форму ўсеагульнасці непасрэдна з прычыны таго, што яго ўспрымае маё Я. Таму сузіранне ёсць *падвядзеннем*. У памяці дзякуючы існаму цяпер сузіранню або ўяўленню ўзнікае вобраз такога самага мінулага сузірання, якое было чымсьці пастаянным і ўсеагульным, пад што я і падводжу існае цяпер адзінкавае сузіранне.

*В. Сіла фантазіі*

§ 145

Пры ўспаміне ўяўленне ранейшага сузірання і існае цяпер сузіранне непасрэдна супадаюць адно з адным. Я маю перад сабой не дваякае сузіранне і ўяўленне, а бачу толькі, што я ўжо меў гэтае сузіранне, што яно ўжо *маё ўласнае*; калі ж я маю перад сабой уяўленне, *разбежнае* з сузіраннем, то гэта і ёсць сіла фантазіі. У гэтай меры, аднак, сузіранне і ўяўленне могуць быць зусім рознымі.

§ 146

1) *Рэпрадукаванне* ўяўлення наогул. Сіла фантазіі як рэпрадукаванне ўяўлення наогул выклікае вобразы і ўяўленні, калі ўжо няма адпаведнага ім сузірання, і дае ім самім *для сябе* ўваходзіць у свядомасць.

§ 147

2) Існуючы як дзейнае, уяўленне ў разнастайнай узаемасувязі злучае адно з адным захаваныя вобразы і ўяўленні, прычым гэтая ўзаемасувязь адрозніваецца ад той, якой яны валодалі як сузіраннямі.

§ 148

Гэтае злучэнне ўяўленняў можа здзяйсняцца адпаведна самым разнастайным вызначэнням, якія змяшчаюцца ў гэтых уяўленнях. Розныя спосабы злучэння *вельмі недакладна* былі названыя *законамі* асацыявання ідэй.

§ 149

Вызначэннем злучэння можа быць больш ці менш павярхоўная або грунтоўная ўзаемасувязь: простая *адначасовасць* або *супольная лакацыя* двух уяўленняў; або якое-небудзь

*падабенства*, нават *кантраст* паміж імі; стасунак адно да аднаго як *цэлага* і *частак*, *прычына* і *ўздзеянне*, *падстава* і *наступства* і г. д., наогул любы від пачуццёвых або духоўных дачыненняў. Гэтая ўзаемасувязь падапрадкавана галоўным чынам якому-небудзь інтарэсу душы, якой-небудзь жарсці або, наогул, духоўнай своеасаблівасці кожнага чалавека.

§ 150

Адрозненне вобразаў ад сузіранняў паказана намі вышэй. Звычайная свядомасць робіць яго непасрэдным падчас няспання і ў здаровым стане. Але ў сне, у незвычайных станах, падчас хваробы адрозненне паміж імі перастае для яго існаваць, і сіла фантазіі пануе над ім насуперак сузіранню і больш высокім духоўным здольнасцям.

§ 151

а) *Сненне*. Падчас сну перад намі праходзяць чароды ўяўленняў, якія мы не адрозніваем ад сузіранняў, выкліканых успамінамі або нават цяперашніх адчуванняў; прычым гэтыя ўяўленні змешваюцца і злучаюцца адно з адным самым выпадковай і адвольным чынам. — У аснове *прадчуванняў*, *відзежаў*, *крозаў* і г. д. ляжаць, што праўда, інтарэсы ці здольнасці, глыбейшыя за простую сілу фантазіі, але яны спалучаны з такім незвычайным узвышэннем апошняй, што ператварае ўнутраныя, цьмяныя адчуванні ў вобразы і *надае ім моц сузіранняў*.

(Суладнасць з прыродай. Так званае прадбачанне. У рэчаіснасці спіць будучыня. Рэчаіснасць ёсць разам з тым і магчымасцю наступнага. Аракулы, прадказанні паводле палёту птушак, вантробах жывёл. Агульны настрой дзякуючы прыродзе, калі жывёлы прадчуваюць землятрусы.

Народы, якія яшчэ жывуць у еднасці з прыродай, звязаныя з ёй мацней, чым мы, якія адарвалі сябе ад прыроды. — Унутранае святло; зносіны з вышэйшымі духамі, вядзьмарская мазь з блёкату; вядзьмаркі адурманьвалі сябе і аддаваліся жахлівай фантазіі, якая рабілася эпідэмічнай. Іх спальвалі тысячамі. — Прывіды; гэта як бы нагода для вонкавых з'яў, якую выкарыстоўвае фантазія. Нячыстае сумленне, катаванае пакутамі ад злачынстваў, дзякуючы прывідным постацям робіцца аб'ектыўным. — Дамовы явіцца адно аднаму ў замагільным жыцці. — Нястрымнае фантазіяванне; фанатызм у намаганнях мацней шанаваць рэлігійныя ўяўленні за ўсю маральнасць у жыцці, за паняцці ў іх стасунках. Фантазіраванне ператвараецца ў шалёную пагоню за безаблічным уладкаваннем відавочнага вонкавага, імкненне паставіць пачуццёвае вышэй за духоўнае, давесці, што вонкавае — гэта і ёсць абсалютнае. У рэчы жадаюць убачыць Бога, не звяртаючыся да мастацтва; або абсалютную сутнасць жадаюць унутрана сузіраць пры дапамозе фантазіі, *Бога прагнуць уціснуць у часавасць, пачуццёвасць.* — Сапраўдная перавага ўяўлення над сузіраннем праз волю, прыклад — Мукій Скевала[1].)

§ 152

b) Больш высокая ступень жыцця, якая заключае сябе ў фантазіі, — *самнамбулізм*, у літаральным сэнсе слова «хаджэнне ў сне», або іншыя станы гэтага кшталту, у якіх

---

[1] Мукій Скевала (традыц. Муцый Сцэвала), юны рымскі патрыцый, які жыў у VI ст. да н. э. і, паводле легенды, паклаў сваю правую руку ў вогнішча і тым самым уратаваў свой край ад захопу этрускім царом Парсенам, які быў моцна ўражаны ягоным учынкам. (*Заўв. перакладчыка.*)

дух, пры вонкава слабейшым або мацнейшым успрыманні, валодае нейкім хутчэй унутраным сузіраннем вонкавага, уласна кажучы, дзейнічае *ўсярэдзіне сябе* і пераходзіць да цэлых серый вонкавых адпраўленняў, якія ён робіць і наяве.

(Самнамбулізм — гэта: α) звычайны самнамбулізм у *сне*: слухаць музыку, чытаць, пісаць лісты, размаўляць, ісці ў небяспечныя месцы, прымаць ванну перад сном; моцныя ўзрушэнні; β) *эпілептычны* (выкліканы рухамі пальцаў, чытаннем на перапоўнены страўнік і г. д.); γ) *магнетычны* — калі хворы адказвае толькі таму, хто выклікаў у ім і падтрымлівае гэты стан.)

§ 153

c) *Вар'яцтва* мае акрамя таго, што трызненне ў ліхаманкавай гарачцы ёсць такім жа выкліканым хваробай станам, вельмі розныя мадыфікацыі, такія, як няцямкасць (Narrheit), утрапёнасць (Wahnsinn), шаленства (Raserei) і г. д., і зводзіцца, уласна кажучы, да панавання фантастычных уяўленняў над сузіраннямі і над разумнымі ўяўленнямі ў стане няспання. Для *няцямкасці* характэрнае якое-небудзь адзінкавае трывалае няслушнае ўяўленне пры слушнасці астатніх уяўленняў усярэдзіне гэтага трывалага ўяўлення. *Утрапёнасць* — гэта агульнае расстройства духоўнай прыроды. Пры *шаленстве*, або буйным вар'яцтве, само вар'яцтва спалучаецца са зласлівым падступствам і прыступамі буянства.

(Уявіць сябе каралём, кардыналам, адным з увасабленняў боства. Меланхолія ад уяўлення сабе маральна нічога не вартым. Нехта думае, што калі ён памочыцца, то затопіць увесь горад; другі — быццам ён ячменнае зярнятка і яго вось-вось здзяўбуць куры; трэці — што ў яго шкляныя ногі, у целе званочак і т. д. — Прычыны вар'яцтва бываюць; α)

*цялесныя*; часта гэта прыродная, спадчынная схільнасць; прыдушванне падчас цяжарнасці; празмернасці; атрутныя зёлкі; сабачае шаленства; хваробатворны пачатак, які наносіць шкоду нервам, мазгам і г. д.; β) *духоўныя*; надзвычай палкае ўяўленне, напрыклад ад радасці людзі не толькі паміралі, але і вар'яцелі; засмучэнне, выкліканае ўзрушэннямі запалу, кахання, гонару, надзеі, ганарыстасці, падману; падазронасці разрывае сувязь з навакольным светам; імкненне закапаць сваё жыццё ўсярэдзіне сябе, усярэдзіне сваёй адзінкавасці і т. д. — Спосабы лячэння душэўных хвароб падзяляюцца, адпаведным чынам, таксама на цялесныя і духоўныя.)

§ 154

3. Прадуктыўная *сіла фантазіі*. Вышэйшая сіла фантазіі, *паэтычная* фантазія, не знаходзіцца на службе ў выпадковых станаў і вызначэнняў пачуцця, а на службе *ідэй* і ісціны духу наогул. Яна адкідае выпадковыя і адвольныя акалічнасці тут-быцця, засяроджвае ўвагу на яго ўнутраным і істотным баку і выяўляе яго ў вобразах. — Гэтая форма быцця ў праяве, якую яна надае яму, падтрымліваецца, кіруецца, праякнутая і злучаная ў адзінства толькі гэтым істотным. — *Сімвалізацыя* сілы фантазіі палягае ў тым, што ў пачуццёвыя з'явы, у вобразы яна ўкладае ўяўленні або думкі *іншага* кшталту — не тыя, якія яны выяўляюць непасрэдна, але якія знаходзяцца з ім у дачыненні *аналогіі* — і выкарыстоўвае гэтыя выявы як выраз гэтага іншага дачынення.

(Паэтычная творчасць — не простае пераймание прыроды. Паэзія праўдзівая ў больш высокім сэнсе, чым звычайная рэчаіснасць. Паэт — гэта глыбокі дух, які дасканала разумее субстанцыю, якая ёсць і ў іншых, але не зразумелая ім. Сцверджанне застаецца справядлівым і тут, што для камердынера няма героя. Кажуць: я гэтага чалавека

таксама ведаў, і нічога такога ў ім не бачыў, або: я таксама зведаў каханне, і не знайшоў у ім нічога падобнага да таго, што кажа пра яго паэт. Але якраз таму паэта і называюць празорцам. — Ён злучае багацце прыроды ў штосьці цэлае, як атрыбут чагосьці больш высокага: сінь нябёсаў — ягонае ўбранне; кветкі — яго вестуны і т. д. — Цэрэра і Празэрпіна. Базіс ідэі. — Лета: незабудка. — Узыход сонца: «Сонца сваё святло разлівала, як дабрадзейнасць — спакой»[1]. Заход сонца: «так памірае герой»[2]. Сімволіка хлеба і віна ў элеўсінскіх містэрыях і ў хрысціянстве. — Глыбока адчувальная душа наогул сімвалізуе схільнасць немцаў да паэтычнага мыслення аб прыродзе і г. д.)

*С. Памяць*

§ 155

1) *Знак* увогуле. Паколькі ўяўленне вызваленае ад вонкавага тут-быцця і зрабілася суб'ектыўным, тут-быццё і ўнутранае ўяўленне процістаяць адно аднаму як розныя з'явы. *Адвольнае* злучэнне якога-небудзь вонкавага тут-быцця з пэўным не адпаведным яму і паводле зместу адрозным ад яго ўяўленнем, так што яно павінна быць уяўленнем або, дакладней, яго *значэннем*, ператварае гэтаг існаванне ў *знак*.

§ 156

*Прадуктыўная* памяць стварае, такім чынам, злучэнне сузірання з уяўленнем, злучэнне, у якім ранейшае стаўленне,

---

[1] Радок з верша нямецкага паэта Ёгана Філіпа Лорэнца Вітгафа (1725—1789). Пераклад наш. — *Заўв. перакладчыка.*

[2] Цытата з драмы Ф. Шылера «Разбойнікі» Пераклад наш. — *Заўв. перакладчыка.*

калі ў аснове стасунку было сузіранне, *перавернутае*. У гэтым злучэнні, якое здзяйсняецца прадуктыўнай памяццю, пачуццёвае тут-быццё не мае ў сабе і для сябе ніякага значэння; яно мае тут толькі тое значэнне, якое яму надае дух.

§ 157

Пачуццёвае тут-быццё дачыняецца праз свае вызначэнні, уласна кажучы, з іншым тут-быццём. Але ў той меры, у якой прадуктыўнай памяццю пэўнае ўяўленне зроблена вызначэннем якога-небудзь тут-быцця, апошняе становіцца ў сувязі з гэтым сутнасным *у дачыненні да ўяўленняў з іншымі істотамі, якія ствараюць уяўленне*, з чаго і пачынаюцца *тэарэтычныя зносіны* гэтых сутнасцяў адна з адной.

§ 158

2) *Мова*. Найвышэйшым творам прадуктыўнай памяці ёсць мова, якая існуе як у гуках, так і на пісьме. Паколькі яе крыніцай ёсць прадуктыўная памяць, або *Мнемазіна*, то пра нейкую іншую яе крыніцу гаворка можа ісці толькі з гледзішча вынаходства пэўных знакаў.

§ 159

*Гук* — гэта мімалётная з'ява ўнутранай сутнасці, якая ў гэтай сваёй праяве не застаецца чымсьці вонкавым, а выяўляе сябе як нешта суб'ектыўнае, унутранае, якое сутнасна нешта значыць. — Асабліва важна тое, што з дапамогай *артыкуляцыі гукаў* могуць быць пазначаныя не толькі *вобразы* ў сваіх вызначэннях, але і *абстрактныя ўяўленні*. — Канкрэтнае ўяўленне наогул ператвараецца *словам-знакам* у нешта *бязвобразнае*, што атаесамляе сябе са знакам.

(Вобраз забіваюць, і слова замяняе сабой вобраз. Гэта — леў; *імя азмяняе сабою рэч.* — Логас; і сказаў Бог... і г. д. Мова — найвялікшая сіла ў чалавечым грамадстве.

— Адам, кажуць, даў усім рэчам (жывёлам) іх імёны.

— Мова — гэта забойства пачуццёвага свету ў яго непасрэдным тут-быцці, знікненне свету дзеля пераўтварэння ў пэўнае тут-быццё, якое ёсць воклічам, што знаходзіць водгук ува ўсіх істотах, якія ствараюць уяўленне.)

§ 160

Што да вынаходства пэўных знакаў, то, натуральна, што гукавымі знакамі для пазначэння з'яў з гучаннем (шуму, свісту, звону, гудзення і г. д.) зроблены іх *непасрэдныя перайманні.* — Для выяўлення іншых пачуццёвых прадметаў або змяненняў знак, уласна кажучы, мае *адвольны характар.* За пазначэнне абстрактных стасункаў і вызначэнняў адказвае галоўным чынам *здольнасць сімвалізаваць*, далейшае ж паступовае развіццё мовы належыць сіле ўсеагульнасці — развазе.

§ 161

*Пісьмовасць* бывае іерагліфічнай або літарнай. Іерагліфічная пісьмовасць — гэта такое пазначэнне прадметаў, якое ніяк не звязана са знакамі, якія гучаць. — Стварэнню ўсеагульнай філасофскай пісьмовай мовы, пра якую шмат хто рупіўся, перашкаджае незлічонае мноства знакаў, якія давялося б адмыслова вынаходзіць і вучыць. — *Літарная* пісьмовасць раскладае знакі-словы на іх простыя гукі і пазначае апошнія.

§ 162

3) *Рэпрадуктыўная памяць.* Рэпрадуктыўная памяць палягае ў запамінанні адзінкавых знакаў у дачыненні да таго, што яны абазначаюць, і перш за ўсё — да ўтрымання

іх бязвобразных шэрагаў, якія не злучаны адзін з адным ані вобразнай, ані разважнай узаемасувяззю, а існуюць у зусім адвольнай або выпадковай паслядоўнасці ды ўтрымліваюцца разам толькі ўнутранай, не залежнай ад іх сілай.

### *III. Мысленне*

### § 163

Мысленне — гэта дзейнасць духу ў яго незалежнай, сабе самой роўнай прастаце, якая бярэ *з сябе самой* і ўносіць *у* сябе *саму* вызначэнні, што маюць характар роўнасці самім сабе і ўсеагульнасці.

### *1) Развага*

### § 164

Развага — гэта здольнасць мысленча вызначаць наогул і фіксаваць у абдуманых вызначэннях. Як *аб'ектыўная* развага яна мае катэгорыі, мысленчыя вызначэнні быцця, што ўтвараюць унутранае адзінства разнастайнасці сузіранняў і ўяўленняў. Яна адрознівае істотнае ад неістотнага і пазнае неабходнасць і законы рэчаў.

### *2) Вынясенне суджэнняў*

### § 165

Рабіць суджэнне адносна чаго-небудзь — значыць ажыццявіць *дачыненне* пэўнага адзінкавага прадмета з паняццем. Наогул, вынясенне суджэння дае вызначэнне адзінкаваму прадмету ўва ўсеагульным аспекце, г. зн. *падпарадкоўвае* яго ўсеагульнаму. Яно мае наступныя ступені:

### § 166

а) Усеагульнае, якім даецца вызначэнне адзінкавага, само тут ёсць толькі адной з з пэўнага ліку яго *якасцяў*.

§ 167

b) *Рэфлексаванне* — гэта выхад па-за межы адзінкавага вызначэння, яго параўнанне з іншымі і абагульненне іх у адным пэўным вызначэнні. — Усеагульнае тут складае ўнутраную прыроду і сутнасць прадмета. Гэтая ўсеагульнасць не ёсць проста агульнасцю, а ўяўляе сабой усеагульнасць, уласцівую гэтаму прадмету як такому, нароўні з уласцівымі яму вызначэннямі асаблівасці ды адзінкавасці.

§ 168

c) *Выносіць дакладнае суджэнне* адносна якога-небудзь прадмета — значыць *параўнаць* яго прыроду, або яго сапраўдную ўсеагульнасць, з яго адзінкавасцю, з характарам яго тут-быцця; параўнаць тое, чым ён ёсць, з тым, чым ён павінен быць.

(У гэтых суджэннях схаваная тая дыялектыка, што нешта дрэннае, нешта не адпаведнае свайму паняццю, *адначасна і адпавядае* яму. *Дрэнны* дом мае тут-быццё, якое не адпавядае паняццю дома. Але калі б ён толькі не адпавядаў паняццю дома, ён не быў бы *домам* (трэба, каб паняцце магло быць пазнавальным яшчэ ў тут-быцці. Так, калі датычна якога-небудзь учынку выносяць суджэнне, што ён кепскі, то ў яго неразумнасці ёсць яшчэ і бок адпаведнасці розуму, і г. д.)

§ 169

Тут можна згадаць таксама і *дасціпнасць*, якая, аднак, хутчэй адносіцца да характару вынясення суджэння, чым ёсць яго сапраўднай ступенню. Яна выяўляецца галоўным чынам у тым, каб улавіць адрозненні, што не ляжаць на паверхні, і з дапамогай рэфлексіі заўважыць больш тонкія і больш глыбокія дачыненні. — *Дасціп* злучае ўяўленні, вонкава зусім чужыя адно аднаму, з таго боку, з якога яны выяўляюць

нечаканае падабенства. — Дасціпнае ёсць аналагам разумнага і выказвае пераважна якое-небудзь вызначэнне або стасунак у тым выглядзе, у якім яны проціпастаўляюцца або непасрэднаму ўяўленню пра іх, альбо ўсярэдзіне саміх сябе.

(Падчас усходу сонца неба ператварылася з чорнага ў чырвонае, як рак. Le misérable, qu'il est heureux! Il a faim[1]. Exul mentisque domusque[2]. — Пад гэтым каменем ляжыць мая жонка; тут яна спачывае, заспакоены і я. — На сваіх ложках тлустыя мараць суддзі заспаць свой кашаль і сваё сумленне і г. д.)

*3) Разумнае мысленне*

§ 170

а) Розум бывае *негатыўным* або *дыялектычным*, бо ён паказвае пераход усякага разумовага вызначэння быцця ў сваю процілегласць. Звычайна гэтае дыялектычнае выяўляецца такім чынам, што адносна Аднаго суб'екта сцвярджаюцца два процілеглыя прэдыкаты. Чысцейшая дыялектыка палягае ў тым, што адносна якога-небудзь разумовага вызначэння-прэдыката паказваецца, як *у ім самім* яно гэтак жа сама ёсць і *процілегласцю сябе самога*, што яно, такім чынам, касуе сябе ўнутры сябе.

§ 171

b) *Развважальны* розум шукае *падставы* рэчаў, г. зн. іх пастуляванасць праз іншае і ўнутры іншага, якая і ёсць пастаяннай прысутнай у сабе сутнасцю гэтых рэчаў, але разам з тым яна ўяўляе сабой толькі нешта *адносна безумоўнае*, бо абгрунтаванае, або наступства, мае змест, адрозны ад зместу падставы.

---

1 Няшчасны праз тое, што шчаслівы! Ён галодны (*франц.*).

2 Без ніякага духу і без дому (*лац.*).

§ 172

c) *Высноўвальны* розум змяшчае апасродкаванне зместу, які выступае адпаведна вызначэнням паняцця ў выглядзе адзінкавага, асаблівага і ўсеагульнага. Асаблівае адносна адзінкавага ёсць нечым усеагульным, а адносна ўсеагульнага — нечым вызначаным; яно ўяўляе сабой сярэдні тэрмін, які змяшчае ў сабе экстрэмумы адзінкавасці і ўсеагульнасці і таму злучае іх. Высноўвальны розум — гэта:

α) *фармальны* розум, калі лагічны вывад суб'ектыўны. Тое, што здаецца ў гэтым выпадку апасродкаваным, або наступствам, само па сабе ёсць нечым непасрэдным. У стасунку да апасродкаванага яно выступае толькі для пазнання.

β) *Тэлеалагічны* розум разглядае і вызначае мэты, г. зн. такі стасунак, у якім нешта апасродкаванае, зробленае мае тое ж самы змест, што і ўзятае ім у якасці перадумовы паняцце, якое ўяўляе сабой нешта непасрэднае; прычым гэтае апасродкаванае, наступства, ёсць тут у той жа меры і падставай.

γ) *Разумная* ідэя — гэта такое паняцце, вонкавы выраз, або рэальнасць, якога цалкам вызначана ім самім і існуе толькі ўнутры свайго паняцця; інакш кажучы, гэта такое існае, якое валодае сваім уласным паняццем і ёсць сродкам самога сябе, прычым сродак тут — у той самай меры і мэта.

## Другі раздзел
## Практычны дух

§ 173

Практычны дух не толькі *мае* ідэі, ён сам *ёсць* жывой ідэяй. Ён — гэта дух, які самаадвольна вызначае сябе і стварае сваім вызначэннем вонкавую рэальнасць. Варта рабіць адрозненне паміж Я, якое ператвараецца ў прадметы,

у аб'ектыўнасць толькі тэарэтычна, ідэальна, і *Я*, якое робіць гэта практычна, рэальна.

§ 174

Практычны дух называюць пераважна *свабоднай воляй*, бо *Я* можа абстрагавацца ад усякай пэўнасці, у якой яно знаходзіцца, і ўва ўсёй вызначанасці застаецца нявызначаным і роўным самому сабе.

§ 175

Воля як унутрана вызначальнае паняцце — гэта перш за ўсё *дзейнасць* і *практычнае дзеянне*. Яна пераносіць свае ўнутраныя вызначэнні ў вонкавае тут-быццё, каб выяўляць сябе як ідэю.

§ 176

Да *ўчынку* належыць *уся сукупнасць* вызначэнняў, што знаходзяцца ў непасрэдна сувязі са здзейсненай ёй зменай тут-быцця. Да *практычнага дзеяння* належыць з гэтага перш за ўсё толькі тое, што ўваходзіла ў *намер* або, інакш кажучы, толькі тое, што было ў свядомасці. Толькі гэта воля прызнае як сваё і як сваю *віну*, якую ёй, уласна, можна прыпісваць. Але ў шырокім сэнсе пад віной трэба разумець і тыя з вызначэнняў учынку, якія не ўсведамляліся, але *маглі* быць усвядомленыя.

§ 177

а) *Практычнае адчуванне* хоць і змяшчае ў сабе практычныя праўныя і практычныя маральныя вызначэнні і законы, але ў непасрэдным, а такім чынам, неразвітым і непрадуманым і, пераважна, у *нячыстым выглядзе* ў выніку дамешвання суб'ектыўнай адзінкавасці. Істотна заўважыць,

што ў практычнага адчування няма ніякага іншага сапраўднага зместу, акрамя пэўным чынам вядомых правоў, абавязкаў і законаў, што, з аднаго боку, практычнае адчуванне цьмянае і вызначанае адзінкавасцю, а з другога — можа быць пастаўлена вышэй пэўнай свядомасці, датычнай іх толькі *ў той меры*, у якой яны *паасобку* прывязаныя да іх, а практычнае адчуванне датычна іх можна лічыць татальнасцю.

§ 178

b) Адчуванне пэўнага практычнага вызначэння і адначасна адчуванне яго супярэчнасці ў тым, што яно ўнутранае, не рэалізаванае, хоць рэалльнасць для яго вельмі істотная, ёсць [прыроднай] *схільнасцю*. Яна ўласцівая суб'ектыўнай прыродзе і скіраваная толькі на сваю вызначанасць. *Пажадлівасць* ёсць *адзінкавым* вызначэннем [прыроднай] схільнасці і, у залежнасці ад таго, адпавядае ці не адпавядае ёй вонкавае тут-быццё, адчуванне робіцца *прыемным* або *непрыемным*. Пры [прыродных] схільнасцях і пажадлівасцях практычны дух застаецца ў натуральнасці і ёсць істотай залежнай, несвабоднай.

§ 179

c) Дух павінен узняцца з пагружанасці ў [прыродныя] схільнасці да такой *усеагульнасці*, калі любыя схільнасці ў сваім адасабленні не лічацца абсалютнымі, а ставяцца на сваё месца і атрымліваюць належную ацэнку толькі ў якасці *момантаў татальнасці*, праз што яны ачышчаюцца ад суб'ектыўнай выпадковасці.

§ 180

Вызначэнні духу якраз і ствараюць яго законы. Але яны не ёсць яго вонкавымі, прыроднымі дэтэрмінацыямі; яго

*адзінае* вызначэнне, у якім і змяшчаюцца *ўсе астатнія*, — гэта яго *свабода*, якая ёсць і формай, і зместам яго закона, што можа быць *юрыдычным*, *маральным* або *палітычным*.

*І. Права*

§ 181

Дух як вольная істота, якая ўсведамляе сябе, ёсць тым роўным самому сабе Я, якое ў сваім абсалютна адмоўным дачыненні ёсць у першую чаргу выключальным Я, адзінкавай свабоднай істотай, або *асобай*.

§ 182

*Права* — гэта стасункі людзей адзін з адным у той меры, у якой яны ёсць абстрактнымі асобамі. *Супярэчыць праву* тое дзеянне, праз якое чалавек не шануецца як асоба, або, інакш кажучы, тое, якое парушае сферу яго свабоды. Такім чынам, праўныя стасункі людзей адзін да аднаго, паводле свайго асноўнага вызначэння, маюць *негатыўны* характар і не патрабуюць, уласна, даваць іншаму штосьці пазітыўнае, а патрабуюць толькі прызнаваць яго як асобу.

§ 183

Вонкавую сферу права і свабоды складае *ўласнасць*, падпарадкаванне нічыёй рэчы маёй уладзе і волі. Валоданне ёсць бокам адвольнага *прыўлашчвання*. Бокам жа ўласнасці як такой ёсць той усеагульны бок, што валоданне ёсць праявай маёй волі, якая павінна шанавацца іншым як нешта абсалютнае.

§ 184

Я магу *адчужаць ад сябе* сваю ўласнасць, а менавіта тое, што ў сапраўднасці ёсць уласнасцю, г. зн., з аднаго боку,

яно мае, а з другога — яно валодае момантам *вонкавасці* датычна яго. — *Неадчужальныя*, такім чынам, мой розум, мая свабода, мая індывідуальнасць і наогул усё тое, што складае істотны змест *усёй* маёй свабоды.

§ 185

Я магу адчужаць сваю ўласнасць, перадаючы іншаму, і *набываць* сабе *чужую* ўласнасць. Гэтае набыццё адбываецца толькі паводле *дамовы*, па ўзаемнай згодзе з боку дзвюх асоб: адной — каб адмовіцца ад пэўнай уласнасці і перадаць яе іншай, другой — прыняць яе.

§ 186

Сфера маёй свабоды ўключае мяне як індывіда і дачыненні рэчы да яе; калі нехта іншы гэтую сферу парушае, то гэта можа мець або толькі той сэнс, што мне не належыць толькі гэтая рэч, прычым асобу маю прызнаюць, або той, што не прызнаюць саму маю асобу, што і бывае ў выпадку гвалтоўнага прычынення шкоды майму целу і жыццю.

§ 187

У маёй асобе іншы непасрэдна абражае сваю ўласную. Гэтак ён здзяйсняе супраць мяне не нешта адзінкавае, а нешта ўсеагульнае. Тое, што ён здзейсніў супраць самога сябе паводле паняцця, трэба здзейсніць датычна яго ў рэчаіснасці. — Калі гэта ажыццяўляецца самой абражанай асобай, то гэта *помста*; калі ж яна здзяйсняецца пэўнай усеагульнай воляй і ў яе імя, то яна мае назву *пакарання*.

§ 188

Права, якое датычыцца ўласнасці, належыць да *грамадзянскага* (*цывільнага*) права; права, якое датычыцца асобы,

ёсць прадметам *крымінальнага* права (*карнага кодэксу*). — Навуку аб асноўных паняццях права назвалі *натуральным правам*, нібыта існуе нейкае права, якое належыць людзям ад прыроды, і нейкае адрознае ад яго права, якое ўзнікае ў грамадстве ў тым сэнсе, што там натуральным правам як сапраўдным правам даводзіцца *часткова ахвяраваць*. У сапраўднасці дзякуючы грамадству ўзнікаюць яшчэ асаблівыя правы, якія адсутнічаюць у тым праве, асновай якога служыць толькі індывід, адзінкавая асоба. Але разам з тым яны і ўяўляюць сабой ліквідацыю аднабаковасці названага прынцыпу і яго сапраўдную рэалізацыю.

### *II. Маральнасць*

### § 189

Маральнасць характарызуецца выказваннем: *разглядай сябе ў сваёй практычнай дзейнасці як свабодную істоту*; або, інакш кажучы, маральнасць дапаўняе [практычную] дзейнасць момантам суб'ектыўнасці, а менавіта патрабаваннем, каб: 1) суб'ектыўнае як лад думак і як намер адпавядала таму, што, уласна, ёсць запаведдзю, і каб тое, што ёсць абавязкам, выконвалася не паводле прыхільнасці, не паводле нейкага непрыемнага абавязку і не дзеля таго, каб фанабэрыцца тым, які ты добры, а паводле пераканання, *бо гэта абавязак*; 2) яна (маральнасць), такім чынам, датычыцца чалавека з прычыны яго асаблівасці і не ёсць чыста негатыўнай, як у выпадку права. Свабодную істоту ты мусіш адпусціць на волю, а асобнаму чалавеку можна нешта ўказваць.

### § 190

*Дабро* — гэта змест абавязкаў, а менавіта тых асноўных вызначэнняў, што ўтрымліваюць неабходныя чалавечыя стасункі; або, інакш кажучы, яно — гэта разумнае ў іх.

*Зло* — гэта тое, што наўмысна накіравана на разбурэнне такіх стасункаў. *Дрэннае* ж — гэта калі свае абавязкі парушаюць хоць і ненаўмысна, але свядома, саступаючы якой-небудзь пачуццёвай схільнасці або покліч сэрца.

§ 191

1. Неабходныя чалавечыя стасункі кожнага чалавека *з самім сабой* палягаюць: a) у *самазахаванні*, у тым, каб індывід падпарадкоўваў сабе вонкавую фізічную прыроду і рабіў яе адпаведнай яму; b) сваёй духоўнай прыродзе ён павінен стварыць незалежнасць ад яго як яго ўласнай фізічнай прыроды; c) ён павінен падпарадкаваць сябе сваёй усеагульнай духоўнай сутнасці і зрабіць сябе адпаведным ёй; [гэта] *адукацыя* наогул.

§ 192

2. *Сямейныя стасункі* ёсць натуральным аб'яднаннем індывідаў. Повяззю гэтага прыроднага грамадства служаць любоў і давер, веданне аб гэтым першапачатковым аб'яднанні і аб практычнай дзейнасці ў духу гэтага ведання. Індывідам, якія складаюць гэтае грамадства, належаць у адпаведнасці з іх асаблівымі вызначэннямі асаблівыя правы; але калі б гэтыя правы сцвярджаліся менавіта ў форме правоў, то маральная повязь гэтага грамадства, дзе кожны галоўным чынам менавіта праз лад думак у каханні і атрымлівае тое, што належыць яму як такому, была б разарваная.

§ 193

3. Маральнае стаўленне да *іншых наогул* грунтуецца на першапачатковай тоеснасці чалавечай прыроды. Унутраны абавязак усеагульнага чалавекалюбства палягае ў добра-

зычлівым ладзе думак і ў аказанні пры адпаведных варунках усеагульных істотных паслуг. Маральны абавязак аказваць больш частыя і працяглыя паслугі вынікае са стасункаў знаёмства і сяброўства, якія грунтуюцца на свабоднай волі.

(Тут скрайнія межы канечнасці. Усё залежыць ад імгнення.)

### *III. Дзяржава (рэальны дух)*

### § 194

Прыроднае грамадства сям'і пашыраецца да ўсеагульнага *дзяржаўнага грамадства*, якое ўяўляе сабой сувязь, што ўзнікла гэтак жа сама дзякуючы прыродзе, як і дзякуючы свабоднай волі, і грунтуецца гэтак жа на праве, як і на маралі, але выступае, наогул, не столькі як грамадства, якое складаецца з індывідаў, колькі як адзіны ўнутры сябе, індывідуальны *народны дух*.

### § 195

*Навука аб дзяржаве* ёсць выяўленнем той *арганізацыі*, якую мае народ як унутры сябе жывое арганічнае цэлае.

### § 196

Дзяржава як нешта ўсеагульнае ўяўляе сабой процілегласць індывідам. Яна тым дасканалейшая, чым больш усеагульнае адпавядае розуму і чым больш індывіды ўтвараюць еднасць з духам цэлага. Істотны лад думак і дзеянняў *грамадзян* датычна дзяржавы і ўрада палягае *не ў сляпым падпарадкаванні* іх загадам і не ў патрабаванні, каб *кожны даваў сваю індывідуальную згоду* на ўстановы і мерапрыемствы дзяржавы, а ў даверы да яе і ў разважлівым падпарадкаванні ёй.

§ 197

У склад дзяржавы ўваходзяць розныя *ўлады*, якія ўяўляюць сабой моманты яе арганізацыі. Заканадаўчая, судовая і выканаўчая ўлада як такія ёсць наогул яе *абстрактнымі* момантамі. Рэальныя ж улады — гэта ўлады, якія канстытуююць цэлае, — судовая і паліцэйская, фінансавая і адміністрацыйная, ваенная і палітычная, у кожнай з якіх, уласна кажучы, і выступаюць згаданыя абстрактныя моманты. Найвышэйшым кіраўнічым цэнтрам усіх уладаў ёсць *урад*.

§ 198

Розныя *станы* (*саслоўі*) ў дзяржаве — гэта, наогул, тыя канкрэтныя адрозненні, адпаведна якім індывіды і падзяляюцца на класы, якія заснаваныя пераважна на няроўнасці багацця, магчымасці заняцця пасад (Beziehung) і адукацыі, якія, у сваю чаргу, збольшага ўгрунтаваныя на няроўнасці па нараджэнні, у выніку чаго індывіды і атрымліваюць да аднаго віду дзейнасці, карыснай для дзяржавы, большую прыдатнасць, чым да якой-небудзь іншай.

§ 199

*Канстытуцыя* вызначае падзел і дачыненні розных дзяржаўных уладаў адна да адной і сферу дзеяння кожнай з іх, галоўным жа чынам правы індывідаў у стасунку да дзяржавы і долю таго садзейнічання, якое кожны з іх абавязаны аказваць дзяржаве не толькі ў выбары ўраду, але і паколькі яны наогул ёсць грамадзянамі.

§ 200

Норавы, законы і канстытуцыя ствараюць унутранае арганізаванае жыццё народнага духу. У іх і выяўленыя від і вызначэнне яго сутнасці. Апроч таго, у народнага духу ёсць вонкавыя стасункі і вонкавыя лёсы.

§ 201

Гэтая, так бы мовіць, *гістарычная гісторыя* (*historische Geschichte*) разглядае існаванне народнага духу, развіццё яго прынцыпу ў яго канстытуцыі і законах, а таксама ў яго лёсах вонкавым чынам, адпаведна ўспрыманню падзей і тым непасрэдным прычынам, якія, здаецца, палягаюць у выпадковых абставінах ды індывідуальных характарах.

§ 202

*Філасофская гісторыя* не толькі асэнсоўвае прынцып народа зыходзячы з яго ўстаноў і лёсаў, а потым выкладае падзеі зыходзячы з гэтага прынцыпу, але разглядае галоўным чынам *усеагульны сусветны дух*, тое, як ён ува ўнутранай узаемасувязі праз гісторыю нацый і іх лёсаў, што фарміраваліся асобна, прайшоў розныя ступені свайго ўтварэння. Яна адлюстроўвае ўсеагульны дух як субстанцыю, што выяўляецца ў яго акцыдэнцыях, так што гэта яго кшталт або, лепш сказаць, вонкавасць утвораны не адпаведна яго сутнасці. Больш высокі выраз яго — гэта фарміраванне яго ў простай духоўнай форме.

(Не ўсе народы ідуць маюць месца ў сусветнай гісторыі. Кожны адпаведна свайму прынцыпу мае свой пункт, момант. Пасля ён знікае са сцэны, відаць, назаўсёды. Не выпадкова надыходзіць яго чарга.)

## Трэці раздзел
## Дух у яго чыстым выяўленні

### *I. Мастацтва*

§ 203

Мастацтва выяўляе дух у індывідуальнай праяве і, у той жа час, ачышчаным як ад выпадковага тут-быцця ды яго змя-

ненняў, так і ад вонкавых умоў, і прытым выяўляе *аб'ектыўна* для сузірання і ўяўлення. Мэтай мастацтва ёсць цудоўнае само па сабе, а не перайманне прыроды, якая сама ёсць толькі часовым і несвабодным перайманнем ідэі. *Эстэтыка* разглядае асаблівыя формы гэтага прыгожага выяўлення.

(Мастацтва залежыць ад таго, якой ёсць субстанцыяльная свядомасць духу. Мы вывучаем грэцкія творы, але не робімся ад гэтага грэкамі. Не *ўяўленню*, а ўнутранаму прадуктыўнаму жыццю мы абавязаныя тым, што мы не грэкі. Фантазія гэтага народа — гэта не нейкія забабоны пра Нешта, а ўласцівы яму дух, так званае цудоўнае — гэта нікчэмная (Lappische) машынерыя; няўдалая выхадка Клопштака[1] з яго анёламі, паўночнымі багамі. Жывая міфалогія народа складае, такім чынам, аснову і змест яго мастацтва.)

§ 204

Трэба адрозніваць дзве галоўныя формы, або *стылі*, мастацтва: *антычны* і *сучасны*. Характар першай формы *пластычны*, аб'ектыўны; характар другой — *рамантычны*, суб'ектыўны. Антычны стыль выяўляе індывідуальнасць адначасова і як усеагульны, істотны характар, не ператвараючы яго пры гэтым ані ў абстракцыю, ані ў алегорыю, а пакідаючы яго жывой татальнасцю. У аб'ектыўнай яснасці і ў аб'ектыўнай скіраванасці ён сцірае усё выпадковае і адвольнае суб'ектыўнага.

§ 205

*Мастацтвы* адрозніваюцца па родах дзякуючы таму *элементу*, у якім яны выяўляюць прыгожае і з дапамогай

---

[1] Тут, відаць, зроблены намёк на сцэны з напышлівай рэлігійна-эпічнай паэмы нямецкага паэта Ф. Г. Клопштака (1724 –1803) «Месіяда».

чаго больш дэталёва вызначаюцца прадмет і дух гэтага выяўлення. Для *вонкавага* сузірання *жывапіс* дае малюнак у фарбах на плоскасці, *разьбярства* — бясколерны малюнак у цялеснай форме. Для *ўнутранага* сузірання *музыка* выяўляе прыгожае ў пазбаўленых уяўлення тонах, *паэзія* — з дапамогай мовы.

(Аратарскае мастацтва, будаўнічае мастацтва, садова-паркавае мастацтва і г. д. не належаць да чыстых прыгожых мастацтваў, бо ў аснове іх, акрамя выяўлення прыгажосці, ляжыць яшчэ і іншая мэта.)

§ 206

Асноўныя роды паэзіі — *эпічны*, *лірычны* і *драматычны*. Першы адлюстроўвае прадмет у выглядзе вонкавай падзеі; другі — адзінкавае пачуццё або, інакш кажучы, суб'ектыўны рух, які адбываецца ў душы; трэці — уласна дзеянне як уздзеянне волі.

*II. Рэлігія*

§ 207

Рэлігія выяўляе абсалютны дух не толькі дзеля сузірання і ўяўлення, але таксама дзеля думкі і пазнання. Галоўнае прызначэнне рэлігіі палягае ў тым, каб узвысіць індывіда да думкі пра Бога, прывесці яго да яднання з Богам і запэўніць індывіда ў гэтым яднанні.

(Рэлігія — гэта праўда ў тым выглядзе, у якім яна існуе для ўсіх людзей. Сутнасцю сапраўднай рэлігіі ёсць *любоў*. Як пазнанне праўды чалавечай волі, яна ёсць перш за ўсё *ладам думак*. Рэлігійная любоў не проста прыродная прыхільнасць, не проста маральнае ўпадабанне і не нейкае няпэўна ўсеагульнае паўразумнае адчуванне — яна пацвярджаецца, у прыватнасці, абсалютным

самаахвяраваннем: «Палюбіце адзін аднаго, як Я палюбіў вас»[1]. Рэлігійная любоў уяўляе сабой *бясконцую* ўладу над усімі канчатковымі праявамі духу: над благім, над злом, над злачынствам, а таксама над станоўчымі законамі і г. д. Хрыстос дазволіў у суботу сваім вучням выдзіраць каласы і ацаліў руку. Боская любоў *адпускае грахі*, робіць для духу *адбытае неадбытым*. Марыі Магдалене шмат што даруецца, бо яна мела шмат любові. Любоў выходзіць нават за межы *меркаванняў маралі*: Марыя мажа алеем Хрыста, замест таго каб даць гэты алей жабракам, і Хрыстос ухваляе гэта. — Субстанцыяльны стасунак чалавека з Богам — гэта адпушчэнне грахоў. Падставай любові ёсць *усведамленне Бога і Яго сутнасці як любові*, вось чаму любоў — гэта разам з тым і найвышэйшая пакора. Не *Я* павінен быць для сябе аб'*ектыўнасцю* ў любові, а *Бог*, але, пазнаючы яго, я павінен *забыцца* на самога сябе. — Адпушчэнне грахоў не ёсць нечым часавым, не ёсць наступствам вонкавага пакарання, а ўяўляе сабой *вечнае*, унутранае дараванне, якое існуе ў духу і душы. У *знішчэнні сваёй нікчэмнасці* і палягае веліч любові. — Субстанцыяльны стасунак чалавека з Богам *падаецца* ў сваёй праўдзе нечым *тагасветным*, але любоў Бога да чалавека і чалавека да Бога знішчае адасобленасць зямнога жыцця ад уяўлянага як тагасветнае, і яна *ёсць вечным жыццём*. Гэтае тоества мы *сузіраем у Хрысце*. Сын чалавечы, ён ёсць і Сынам Божым. Для Богачалавека не існуе тагасветнага. Ён шануецца не як вось гэты адзінкавы, а як усеагульны, як сапраўдны чалавек. Вонкавы бок яго гісторыі неабходна адрозніваць ад рэлігійнага. Прайшоўшы праз рэчаіснасць, праз прыніжальнае, ганебнае, ён памёр.

---

[1] Ян, 13:34. *Пераклад В. Сёмухі.*

Яго *боль* быў найглыбейшай праявай адзінства боскай і чалавечай прыроды у жыцці і ў пакутах. *Блажэнныя багі* язычнікаў уяўляліся як бы ў тагасвецці; Хрыстом жа асвечана сама звычайная рэчаіснасць, гэтае нізкае, якое зусім не пагарджанае, *а нават заговнае*. Яго *ўваскрэсенне і ўнебаўшэсце* існуюць толькі для веры: Стэфан меў вiдзежу, у якой ён бачыў Хрыста *ў яго абліччы* праваруч ад Бога. Менавіта вяртанне ў сябе і складае вечнае жыццё Бога. Узбуджаць жа зыходзячы з асобных абставінаў, з дэталяў сумнеў у тым, ці было гэта вонкавай рэчаіснасцю, неразумна і варта жалю. Для веры не мае значэння тое, што *адбываецца і ўспрымаецца пачуццёва*, для яе важнае тое, што *адбываецца вечна*. Гісторыя *Бога*.

*Замірэнне* Бога з чалавекам як тое, што *само па сабе і для сябе адбылося*, а не як выпадак, не як самавольства Бога, усведамляецца ў *царкве*. Ведаць гэта ёсць *святым духам* абшчыны. — *Царства Божае* — гэта перш за ўсё тая *нябачная царква*, якая ахоплівае ўсе рэгіёны і розныя рэлігіі; вось тады — *вонкавая царква*. — У каталіцкай царкве абшчына падзелена ўнутры сябе на *святароў* і *свецкіх*. Святары маюць паўнамоцтвы і ўладу. Замірэнне з Богам здзяйсняецца часткова вонкавым чынам; наогул у каталікоў пануе менш духоўная рэчаіснасць рэлігіі. У *пратэстантаў*, аднак, *святары — толькі настаўнікі*. Усе ў абшчыне перад Богам як *прысутным* духам абшчыны роўныя. Творы як такія — бяссільныя. Важныя вера і лад думак. Зло прызнаецца як нешта само па сабе нікчэмнае. Гэтым болем чалавек павінен быць прасякнуты. Каб злучыцца з Богам насуперак злу, ён павінен, калі ён адмаўляецца ад зла і адыходзіць ад яго, свабодна прыняць Боскую ласку. Толькі ў душы дасягаецца сапраўднае яднанне з Богам. У ёй праясняецца і пачуццёвая форма святых сакрамантаў.

### *III. Навука*

§ 208

Навука — гэта спасцігальнае пазнанне абсалютнага духу. Паколькі ён успрымаецца ёю ў форме паняцця, кожнае чужое абсалютнаму духу быццё знятае ў гэтым веданні, і апошняе дасягнула поўнай роўнасці з самім сабой. Гэта паняцце, якое мае зместам само сябе і сябе спасцігае.

# ГОТФРЫД ФРЫДРЫХ ВІЛЬГЕЛЬМ ГЕГЕЛЬ

## *Кароткая біяграфічная даведка*

Гэтага мысляра, разам з Імануэлем Кантам, Ёганам Готлібам Фіхтэ, Фрадрыхам Вільгельмам Шэлінгам і Людвігам Фоербахам, адносяць да стваральнікаў класічнай нямецкай філасофіі. Яго вучэнне т. зв. аб'ектыўнага ідэалізму лічыцца адным з самых складаных у гісторыі філасофіі, а ягоны ўплыў можна параўнаць з уплывам Платона, Арыстотэля і Канта. Гегеля называюць заснавальнікам сістэматычнай тэорыі дыялектыкі, цэнтральныя паняцці якой — развіццё як сутнасная рыса дзеяння сусветнага духу, супярэчнасць як унутраная крыніца любога развіцця і г. д.. У сваёй «Фенаменалогіі» Гегель паказвае развіццё філасофскай думкі да распрацоўкі канцэпту розуму. Гэта азначае рэфлексію над сабой як свядомасць датычна самога сябе. Іншыя яго фундаментальныя метады ўключаюць тэзу аб тоеснасці думкі і рэчаіснасці. Працы Гегеля таксама сталі зыходным пунктам для шматлікіх іншых плыняў ува ўсёй сферы культуры...

Георг Фрыдрых Вільгельм Гегель нарадзіўся 27 жніўня 1770 г. у Штутгарце, паходзіў са старой сям'і дзяржаўных службоўцаў і тэолагаў. Спачатку ён наведваў нямецкую і лацінскую школы ў Штутгарце. Пасля таго ён быў вучнем тамтэйшай «Гімназіі Illustre», пакуль не скончыў яе ў 1788 г. Асаблівыя школьныя поспехі Гегеля далі магчымасць атрымаць стыпендыю, якая дазволіла яму з 1788 па 1793 г. штудыяваць філалогію, матэматыку і філасофію, а пасля атрымання ступені магістра ў 1790 г. таксама вывучаць тэалогію ў Цюбінгенскім кляштары. Якраз тады ён пазнаёміўся з будучым паэтам Фрыдрыхам Гёльдэрлінам і будучым

філосафам Фрыдрыхам Вільгельмам Шэлінгам, з якімі потым падтрымліваў сяброўскія стасункі. У той час Гегель асабліва цікавіўся антычнасцю і Французскай рэвалюцыяй. Пасля вучобы ў кляштары Гегель працаваў прыватным настаўнікам у Берне і Франкфурце-на-Майне. Атрыманая спадчына прынесла Гегелю фінансавую падтрымку, дзякуючы якой ён мог напоўніцу прысвяціць сябе сваім заняткам філасофіяй.

У 1801 г. выйшла яго праца «Розніца паміж сістэмамі Фіхтэ і Шэлінга». У наступным годзе выйшла праца пад назвай «Вера і веданне». Знаёмства з Шэлінгам дазволіла Гегелю атрымаць ступень доктара ў Енскім універсітэце. У 1805 г. ён стаў дацэнтам філасофіі. У гэты час паэты Наваліс, Людвіг Цік і браты Фрыдрых і Аўгуст Вільгельм Шлегелі зрабілі горад Ену цэнтрам нямецкага рамантызму. Пры гэтым у тамтэйшым універсітэце Фрыдрых Шылер выкладаў гісторыю, а мысляры Ёган Готліб Фіхтэ і згаданы Шэлінг — філасофію. У 1806 г. Напалеон разбіў войскі Прусіі, Расіі і Саксоніі пад Енай і Аўэрштэтам. Пруская імперыя распалася, і Гегель пакінуў Ену. У тым самым годзе ён скончыў працу над сваёй першай ключавой працай «Фенаменалогія духу», што была выдадзена ў 1807 г. у Бамбергу і Вюрцбургу. Тады ж ён нядоўгі час працаваў рэдактарам газеты «Bamberger Zeitung».

Неўзабаве Гегель стаў рэктарам гімназіі «Дgidyen» у Нюрнбергу, якой кіраваў да 1815 г. У гэты перыяд яго жыцця выйшлі першыя два тамы другой важнай працы, «Навука логікі». Трэці том з'явіўся ў 1816 г. У «Навуцы логікі» аўтар выбудоўвае тэорыю развіцця абсалюту.

Пасля ад'езду з Нюрнберга Гегель адправіўся ў Гайдэльберг, дзе ў наступныя гады займаў кафедру філасофіі. Там у 1817 г. ён выпусціў «Энцыклапедыю філасофскіх навук»,

у якой усебакова выклаў уласную філасофскую сістэму. Энцыклапедыя сістэматычна абагульняе падыходы Гегеля, сфармуляваныя ў іншых яго працах дзеля выкладу агульнага погляду на свет, які таксама змяшчае яго натурфіласофскія ідэі. Пазней яго сістэма істотным чынам паўплывала на марксізм і неагегельянства, а ў вялікай ступені — і на сучасныя філасофскія сістэмы.

У 1818 г. Гегель пакінуў Гайдэльберг і пераехаў у Берлін. Там ён стаў пераемнікам Фіхтэ на філасофскім факультэце ўніверсітэта. У 1821 г. была апублікаваная яго «Філасофія права». У гэтай працы Гегель тлумачыць сваю ідэю практычнай філасофіі, у якой права азначае мараль, а мараль трактуецца як форма волі розуму.

З 1822 па 1830 год Гегель рэгулярна чытае лекцыі «Аб філасофіі сусветнай гісторыі». Гэта дало яму статус не толькі прускага дзяржаўнага філосафа, але і найбольш значнага, паводле вызначэння яго сучаснікаў, нямецкага філосафа. У прыватнасці, велізарны ўплыў на сучасных яму і пазнейшых філосафаў аказалі яго лекцыі па эстэтыцы, філасофіі рэлігіі і гісторыі, у якіх ён выклаў сваё вучэнне аб «абсалютным духу». Яго іншымі аб'ектамі навуковай зацікаўленасці ў гэты час таксама былі філасофія права, мастацтва і гісторыя філасофіі.

Геарг Фрыдрых Вільгельм Гегель памёр ад халеры 14 лістапада 1831 г. у Берліне.

На жаль, да гэтага часу не існуе поўных беларускіх перакладаў прац Гегеля. У выдадзенай у 2019 г. у гэтым жа выдавецтве кнізе «Уводзіны ў філасофію. Нарысы. Тэксты» змешчаныя фрагменты такіх гегелеўскіх прац, як: «Энцыклапедыя філасофскіх навук», «Лекцыі з гісторыі філасофіі», «Навука логікі».

# СЛОЎНІК
## ГЕГЕЛЕЎСКІХ ПАНЯЦЦЯЎ І ВЫЗНАЧЭННЯЎ

**Affektion** *f* афекцыя, узбуджанасць
**Ahnung** *f* прадчуванне
**Akzidenz** *f* акцыдэнцыя, выпадковая праява
**Allgemeines** *n* усеагульнае
**Anderssein** *n* іншабытнасць
**Anschauen** *n*, Anschauung *f* сузіранне
**apodiktisch** ападыктычны
**Art** *f* від, разнавіднасць; спосаб; кшталт
**Assertion** *f* сцвярджэнне
**assertorisch** асертарычны, сцвярджальны
**Aufbau** *m* будова, структура
**Ausdruck** *m* выяўленне
**Ausschließen** *n* выключэнне
**Außenwelt** *f* вонкавы свет
**äußerlich** вонкавы
**Äußerlichkeit** *f* вонкавае
**Auswirkung** *f* уздзеянне
**Band** *n* повязь
**Bedingtes** *n* абумоўленае
**Bedingung** *f* умова
**Bedeutung** *f* значэнне, сэнс
**Begebenheit** *f* падзея
**Begreifen** *n* разуменне
**Begriff** *m* паняцце
**Begründung** *f* абгрунтаванне
**Behauptung** *f* сцверджанне
**Beobachtung** *f* назіранне
**Beschaffenheit** *f* уласцівасць; стан
**Besitz** *m* валоданне
**Besonderes** *n* асаблівае
**Besonderheit** *f* асаблівасць
**Besonderung** *f* адасабленне
**Bestandteil** *m* складнік, кампанент, складовая частка
**Bestätigung** *f* пацверджанне
**Bestimmtheit** *f*, **Bestimmtsein** *n* вызначанасць
**Bestimmung** *f* вызначэнне; прызначэнне
**Besonderes** *n* асаблівае
**Beweis** *m* доказ
**Bewusstsein** *n* свядомасць
**Beziehen** *n* суаднясенне
**Beziehung** *f* дачыненне
**Bild** *n* вобраз; выява
**Bleibendes** *n* пастаяннае
**Böses** *n* зло
**Charakterzug** *m* характэрная рыса, асаблівасць
**daseiend** тут-бытны
**Dasein** *n* тут-быццё
**Definition** *f* дэфініцыя
**Denken** *n* мысленне
**Denkform** *f* форма мыслення
**Dieselbigkeit** *f* таясамасць
**Diesseits** *n* зямны свет
**Ding** *n* рэч
**Disjunktion** *f* дыз'юнкцыя

**Diskretion** *f* стрыманасць
**Eigenschaft** *f* уласцівасць, рыса, характарыстыка
**Einbildung** *f* фантазія
**Einheit** *f* адзінства
**Einzelnes** *n* адзінкавае
**Einzelheit** *f* адзінкавасць
**Element** *n* стыхія; элемент
**Empfindung** *f* успрыманне, адчуванне
**Empirie** *f* эмпірызм
**Entäußerung** *f* адчужэнне
**Entgegensetzung** *f* процiпастаўленне
**Entschluss** *m* намер; рашэнне
**Erfahrung** *f* досвед
**Ergebnis** *n* вынік
**Erkennen** *n* пазнанне
**Erschlossenes** *n* выснаванае
**Etwas** *n* нешта
**Existenz** *f* існаванне
**Existierendes** *n* існае
**Extrem** *n* экстрэмум, крайні тэрмін
**Fassungskraft** *f* здольнасць спасціжэння
**Folge** *f* наступства
**Form** *f* форма
**Fortgang** *m* пастулальны рух
**freier Wille** *m* свабодная воля
**Freiheit** *f* свабода
**Ganzes** *n* цэлае
**Gattung** *f* род; гатунак
**Gebiet** *n* абсяг
**Gebilde** *f* будова; утварэнне
**Gebot** *n* запаведзь
**Gedanke** *m* думка
**Gefühl** *n* пачуццё; адчуванне
**Gefühltes** *n* адчутае
**Gegensatz** *m* процілегласць; антытэза
**Gegenstand** *m* прадмет; аб'ект
**Gegenständlichkeit** *f* прадметнасць
**Geist** *m* дух
**Gemüt** *n* душа
**Gesetz** *n* закон
**gesetzt** пастуляваны, закладзены
**Gesinnung** *f* лад думак, настрой; з'ява
**Gestalt** *f* кшталт; постаць
**Gestaltung** *f* фарміраванне, утварэнне
**Grund** *m* падстава, аснова
**Grundsatz** *m* прынцып
**Gutes** *n* дабро
**Handeln** *n* [практычная] дзейнасць
**Handlung** *f* дзеянне
**Hervorbringung** *f* здзясненне, стварэнне; акт тварэння
**Ideal** *n* ідэал
**Idealität** *f* ідэальнасць
**ideell** ідэальны
**identisch** тоесны
**Identität** *f* тоеснасць
**Inhärenz** *f* уласцівасць
**innerlich** унутраны
**Innerlichkeit** *f* унутраная сут-

насць
**Intussuszeption** *f* інвагінацыя
**Irritabilität** *f* раздражняльнасць
**Jenseits** *n* тагасветнае; тагасвецце
**Juxtaposition** *f* супастаўленне
**Kausalität** *f* каўзальнасць, прычыннасць
**kontinuierlich** непарыўны
**Kontinuität** *f* непарыўнасць
**kontradiktorisch** кантрадыктарны
**konträr** кантрарны
**Körperlichkeit** *f* цялеснасць
**Lehre** *f* вучэнне
**Merkmal** *n* прыкмета
**Mitte** *f* сярэдзіна; сярэдні тэрмін
**Moment** *m* момант
**Nachahmung** *f* пераймание
**Natur** *f* прырода
**negativ** негатыўны, адмоўны
**Negativität** *f* негатыўнасць, адмоўнасць
**Nichts** *n* нішто
**partikulär** партыкулярны
**Person** *f* асоба
**Persönlichkeit** *f* індывід(уальнасць), асоба
**Pflicht** *f* абавязак
**Phantasieren** *n* трызненне
**positiv** пазітыўны, дадатны, станоўчы
**Prädikat** *n* прэдыкат
**Prämisse** *f* перашапастулат
**Produkt** *n* прадукт
**Qualität** *f* якасць
**qualitativ** якасны
**Quantität** *f* колькасць
**quantitativ** колькасны
**Quantum** *n* вызначаная (абмежаваная) колькасць
**räsonierend** разважальны
**Realität** *f* рэальнасць
**Recht** *n* права
**reell** рэальны
**Relation** *f* (су)адносіны
**Reproduktion** *f* рэпрадукаванне
**Repulsion** *f* адштурхоўванне
**Satz** *m* выказванне; *гл. тс.* Grundsatz
**Scharfsinn** *m* дасціпнасць
**schließend** высноўвальны
**Schluss** *m* лагічны вывад
**Schlusssatz** *m* заключэнне
**seiend** існы
**Sein** *n* быццё
**Selbstbestimmung** *f* самавызначэнне
**Selbsterhaltung** *f* самазахаванне
**Selbstleben** *n* жыццё самасці
**Selbstzweck** *m* самамэта
**Sensibilität** *f* адчувальнасць
**singular** сінгулярны
**Sinn** *m* сэнс
**sinnlich** пачуццёвы
**Sollen** *n* павіннасць

**sollizitierend** які выклікае
**spekulativ** спекулятыўны
**Sphäre** *f* сфера
**statutarisch** статутарны, адпаведны статуту
**Subjekt** *n* суб'ект
**Substanz** *f* субстанцыя
**Subsumierung** *f* падпарадкаванне
**Subsumtion** *f* падвядзенне
**Tat** *f* учынак
**Tätigkeit** *f* дзейнасць
**Traum** *m* мроя; сон
**Träumen** *n* сненне
**Traumschlaf** *m* сон
**Trieb** *m* схільнасць
**Umstände** *m pl* абставіны
**Unterschied** *m* адрозненне
**Ursache** *f* прычына
**Urteil** *m* суджэнне
**Urteilen** *n* вынясенне суджэння
**Verbindung** *f* сувязь
**Verhalten** *n* паводзіны
**Verhältnis** *n* стасунак; стаўленне; варунак
**Verknüpfung** *f* злучэнне
**Vermittlung** *f* апасродкаванне
**Vernunft** *f* розум
**vernünftig** разумны
**Versicherung** *f* запэўненне
**Verstand** *m* развага
**Verständiges** *n* разважлівае
**Vision** *f* відзежа
**Vorstellung** *f* уяўленне
**Wahres** *n* праўдзівае
**wahrhaft** сапраўдны
**Wahrheit** *f* праўда, ісціна
**Weltordnung** *n* светаўладкаванне
**Werden** *n* станаўленне
**Wesen** *n* сутнасць; істота
**wesentlich** істотны
**Widerspruch** *m* супярэчнасць
**willkürlich** адвольны
**Wirken** *n* творчасць, дзейнасць
**Wirksamkeit** *f* дзейснасць
**Wirkung** *f* вынік; дзеянне; уплыў
**Wissen** *n* веданне
**Wissenschaft** *f* навука
**Zufälligkeit** *f* выпадковасць
**Zusammenfassung** *f* падсумаванне, звядзенне
**Zusammenhang** *m* узаемасувязь
**Zweck** *m* мэта
**Zweckmäßigkeit** *f* мэтазгоднасць

*Склаў Л. Баршчэўскі.*

# ЗМЕСТ

## ПЕРШЫ АДДЗЕЛ
## ВУЧЭННЕ АБ ПАНЯЦЦІ


[Уводзіны] (§ 1)........................................5

*Першы раздзел.* Вучэнне аб паняцці........................5

I. Паняцце (§§ 2—10)........................................5

II. Суджэнне (§§ 11—14)........................................ 8

A. Якасць суджэнняў ці суджэнні ўласцівасці (§§ 15—22)........................................ 9

B. Колькасць суджэння або суджэнні рэфлексіі (§§ 23—30)........................................12

C. Суадносіны суджэнняў, або суджэнні неабходнасці (§§ 31—34)........................................14

D. Мадальнасць суджэнняў, або суджэнні, якія суадносяць паняцце з тут-быццём (§§ 35—38)........................................15

III. Лагічны вывад (§§ 39—41)........................................16

A. Лагічныя вывады якасці або ўласцівасці (§§ 42—47)........................................17

B. Лагічныя вывады колькасці, або рэфлексіі (§§ 48—50)........................................19

C. Лагічныя вывады дачыненняў (§§ 51—55)........................................21

*Другі раздзел.* Рэалізацыя паняцця (§§ 56—65)........................ 22

*Трэці раздзел.* Вучэнне аб ідэях (§§ 66—67)........................25

I. Ідэя жыцця (§§ 68—69)........................................ 26

II. Ідэя пазнання і дабра (§ 70) ........................................ 26

1) Пазнанне (§§ 71—79)........................................ 26

2) Павіннасць або дабро (§§ 80—83) ........................ 28

III. Ідэя ведання або праўды (§§ 84—87)........................ 29

# ДРУГІ АДДЗЕЛ
# ФІЛАСОФСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ


Уводзіны (§§ 1–11) ........ 31
Першая частка. Логіка (§§ 12–15) ........ 33
*Першы раздзел.* Онталагічная логіка ........ 35
I. Быццё ........ 35
A. Якасць ........ 35
a) Быццё (§ 16) ........ 35
b) Тут-быццё (§§ 17–21) ........ 35
c) Змяненне (§§ 22–23) ........ 36
B. Колькасць ........ 37
a) Для-сябе-быццё (ідэальнасць) (§§ 24–27) ........ 37
b) Абмежаваная колькасць (Quantum) (§§ 28–31) ........ 38
C. Бясконцасць (§ 32) ........ 39
II. Сутнасць ........ 39
A. Паняцце сутнасці (§§ 33–35) ........ 39
B. Прынцып (§§ 36–41) ........ 40
C. Падстава і абгрунтаванне ........ 41
1. Цэлае і часткі (§ 42) ........ 41
2. Сіла і яе выяўленне (§§ 43–45) ........ 41
3. Вонкавае і ўнутранае (§§ 46–47) ........ 42
III. Рэчаіснасць (§ 48) ........ 43
1. Субстанцыя (§§ 49–50) ........ 43
2. Прычына (§§ 51–52) ........ 44
3. Узаемадзеянне (§ 53) ........ 44
*Другі раздзел.* Суб'ектыўная логіка ........ 44
I. Паняцце (§§ 54–57) ........ 44
II. Суджэнне (§§ 58–59) ........ 45
a) Якасць суджэння, або вызначэнне прэдыката (§ 60) ........ 45
b) Колькасць суджэння, або вызначэнне суб'екта (§ 61) ........ 46

c) Адносіны суджэння, або вызначэнне дачынення (§§ 62—64) ........ 46
III. Лагічны вывад (§§ 65—83) ........ 47
*Трэці раздзел.* Вучэнне аб ідэях (§ 84) ........ 53
I. Ідэя жыцця (§§ 85—93) ........ 53
II. Ідэя пазнання (§ 94) ........ 56
III. Абсалютная ідэя, або веданне (§ 95) ........ 56

Другая частка. Навука аб прыродзе (§§ 96—98) ........ 56
*Першы раздзел.* Матэматыка (§§ 99—109) ........ 57
*Другі раздзел.* Фізіка ........ 60
I. Механіка (§§ 110—115) ........ 60
II. Фізіка неарганічнага свету (§§ 116—120) ........ 61
*Трэці раздзел.* Фізіка арганічнага свету (§§ 121—126) ........ 63

Трэцяя частка. Навука аб духу (§§ 127—128) ........ 66
*Першы раздзел.* Дух у ягоным паняцці (§§ 129—132) ........ 66
I. Пачуццё ........ 67
II. Уяўленне (§§ 133—134) ........ 67
A. Успамін (§§ 135—144) ........ 68
B. Сіла фантазіі (§§ 145—154) ........ 71
C. Памяць (§§ 155—162) ........ 76
III. Мысленне (§ 163) ........ 79
1) Развага (§ 164) ........ 79
2) Вынясенне суджэнняў (§§ 165—169) ........ 79
3) Разумнае мысленне (§§ 170—172) ........ 81
*Другі раздзел.* Практычны дух (§§ 173—180) ........ 82
I. Права (§§ 181—188) ........ 85
II. Маральнасць (§§ 189—193) ........ 87
III. Дзяржава (рэальны дух) (§§ 194—202) ........ 89
*Трэці раздзел.* Дух у яго чыстым выяўленні ........ 91
I. Мастацтва (§§ 203—206) ........ 91
II. Рэлігія (§ 207) ........ 93
III. Навука (§ 208) ........ 96

Георг Фрыдрых Вільгельм Гегель. *Кароткая біяграфічная даведка* ................................................ 97
Слоўнік гегелеўскіх тэрмінаў і вызначэнняў. *Склаў Л. Баршчэўскі*.........................................................100

*Літаратурна-мастацкае выданне*

Серыя «Галерэя чалавечай думкі»

**Гегель** Геарг Ф. В.

**ВУЧЭННЕ АБ ПАНЯЦЦІ І ФІЛАСОФСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ**

Адказны за выпуск *Зміцер Колас*

12+

Падпісана ўдрук 19.04.2023. Фармат 84×108 $^{1}/_{32}$.
Папера афсетная. Друк лічбавы.
Ул.-выд. арк. 3,41. Ум. друк. арк. 5,67.
Наклад 55 асобнікаў. Заказ № 658.

Выдавец індывідуальны прадпрымальнік Зміцер Колас.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюдніка
друкаваных выданняў № 1/291 ад 17.04.2014.
Пр. Незалежнасці, 105-14, 220114, Мінск.

Вытворчае даччынае ўнітарнае прадпрыемства
«Друкарня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюдніка
друкаваных выданняў № 2/18 ад 26.11.2013.
Пл. Свабоды, 23-103, 220030, г. Минск.